Гос. Пуб. Б. Уз.С.С.Р.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 200 (6176) | 29 жніўня 1938 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Аб выкананні пастаноў СНК БССР ад 9 ліпеня і ад 8 жніўня па пытанню аб падрыхтоўцы да перапісу насельніцтва 1939 года па Магілеўскай вобласці. Пастанова Совета Народных Камісараў БССР.

Напярэдадні прызыва ў Чырвоную Армію.

Агульнамаскоўскі сход прызыўнікоў. — Выступленне тав. А. І. Угарава.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЕ.

Х. Л. Раксін. — Партарганізацыя ў барацьбе за промфінплан.

Комсамольцы-пагранічнікі рыхтуюцца да 20-годдзя ленінскага комсамола.

А. Любімцаў. — Лепшыя комсамольцы ўступаюць у рады партыі.

АРТЫКУЛЫ:

Капітан **Сцежэнка.** — Што адбылося ў раёне возера Хасан?

Янка Купала, Якуб Колас, Пятрусь Броўка. — Да юбілею вялікага паэта-рэволюцыянера.

Будзем дапамагаць школе ў выхаванні нашых дзяцей (адкрытае пісьмо бацькоў вучняў 7-б класа 45-й школы г. Менска).

Множацца поспехі стаханаўцаў.

Р. Сяргеенка. — Прапускаюць лепшыя тэрміны сяўбы.

Г. Паўлаў. — Зрываюць сіласаванне кармоў.

Д. Пульянаў. — Сельскі дом культуры.

ЗА РУБЯЖОМ:

На франтах у Іспаніі.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі.

Становішча ў Чэхаславакіі.

Унутрыпалітычны крызіс у Францыі.

Арышт агентаў генерала Франко ў Парыжы.

Абстрэл аўтамабіля італьянскага пасла пры «ўрадзе» Франко.

«Эвр» аб германа-італьянскім пагадненні аб падзеле Іспаніі.

Новыя мабілізацыйныя мерапрыемствы Германіі.

МАЦАВАЦЬ АХОВУ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ УЛАСНАСЦІ

Несакрушальнай эканамічнай асновай соцыялістычнай дзяржавы працоўных нашай мацеры-радзімы — з'яўляецца грамадская соцыялістычная ўласнасць. Неабсяжныя прасторы палёў Совецкага Саюза, багацейшыя нетры яго зямель, густыя лясы, гіганты-заводы, фабрыкі, транспарт... усё, чым незлічона багата соцыялістычная дзяржава — з'яўляецца ўсенароднай уласнасцю, гранітным фундаментам чароўнага будынка комунізма, які пераможна будуе совецкі народ пад мудрым кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна.

Праклятая банда гнусных рэстаўратараў капіталізма, фашысцкіх шпіёнаў, трацкістаў, бухарынцаў, буржуазных нацыяналістаў і іншай падалі ўсімі сіламі і сродкамі імкнулася падарваць аснову совецкага ладу. Шалёныя сабакі фашызма, смяротна ненавідзячы працоўных, імкнуліся нанесці шкоду соцыялістычнай уласнасці. Доблесная совецкая разведка раскрыла карты ворагаў, іх стаўкі біты. Нікчэмныя чэрві растаптаны. Совецкі народ вылавіць і знішчыць усіх да аднаго здраднікаў радзімы і соцыялізма, якія ўздумаюць падняць руку на свяшчэнную аснову совецкага ладу, на шчаслівае жыццё працоўных.

Партыя, совецкі ўрад мабілізоўваюць усе сродкі для таго, каб забяспечыць недатыкальнасць непахіснай асновы совецкага ладу. Партыя патрабуе непрымірыма і рашуча змагацца з усякімі праявамі безадказнасці, разгільдзяйства і бесклапотнасці, якія вядуць да псавання народнай маемасці.

Неабходна памятаць, што адным з улюбёных метадаў шкодніцкай работы ворагаў народа з'яўляецца падпал фабрык, заводаў, калгасаў, МТС. Мацёрыя дыверсанты падсоўвалі дзецям запалкі, быццам-бы ненаўмысна кідалі гарашчыя акуркі, пад рознымі прадлогамі парушалі правілы пажарнай бязапаснасці, наўмысна ігнаравалі ўказанні пажарнага нагляду.

Як відаць, не ўсе гаспадарнікі, не ўсе кіраўнікі раёнаў і сельсоветаў зрабілі з гэтых фактаў адпаведныя ўрокі. Праяўленне абыякавых адносін да мабілізацыі ўсяго насельніцтва на барацьбу з пажарамі, праяўленне ідыёцкай бесклапотнасці, на жаль, яшчэ часта мае месца.

Нядаўна ў агні пажару згарэла маемасць 54 калгасных двароў вёскі Сідаравічы, Чачэрскага раёна. Дзесяткі гектараў добрага страявога лесу загінула ў агні ў Халопеніцкім раёне. Аб чым гэта сведчыць? Толькі аб тым, што ахова соцыялістычнай уласнасці ад агню ў гэтых раёнах далёка не на вышыні патрабаванняў, прад'яўляемых партыяй і ўрадам. Аналіз прычын узнікнення пажараў у гэтых раёнах даказвае поўную бестурботнасць іх кіраўнікоў, адсутнасць масава-растлумачальнай работы сярод насельніцтва і патуранне тым, хто ігнаруе рашэнні ўрада аб проціпажарных мерапрыемствах і ўказанні пажарнага нагляду.

Зусім нядаўна грубае парушэнне правіл проціпажарнай бязапаснасці ў час малацьбы і дрэнны догляд за трактарам прывялі да пажару ў калгасе «Зара», Рагаўскага сельсовета Заслаўскага раёна.

Гэты выпадак павінен навучыць кіраўнікоў МТС і калгасаў паважаць правілы проціпажарнай бязапаснасці, арганізаваць такую ахову багатага ўраджаю, якая выключае ўсякую магчымасць псавання і страт ад агню. Неабходна пераглядзець усе дэталі арганізацыі сушкі і малацьбы ўраджаю, закрыць усе шчыліны і лазейкі для варожых паследышаў, рашуча знішчыць ліберальныя адносіны да антылзяржаўнай практыкі ігнаравання правіл проціпажарнай бязапаснасці.

Нецярпіма дабрадушнасць, з якой некаторыя гаспадарнікі, кіраўнікі калгасаў, сельскіх советаў адносяцца да псавання і раскрадання проціпажарнага інвентару. Так, напрыклад, у горацкім сельскагаспадарчым інстытуце, не гледзячы на сур'ёзныя папярэджанні пажарнай аховы, не прыводзяць у парадак сетку воданапорных калонак, гнояць дорага каштуючае абсталяванне.

У калгасе «Новая ніва», Свіслацкага сельсовета Асіповіцкага раёна проціпажарны інвентар валяецца дзе папала. Пажарныя бочкі рассохліся, багры, сякеры, лапаты раскіданы. Праўленне калгаса мірыцца з тым, што добраахвотная пажарная дружына існуе толькі на паперы, а начальнік яе тав. Норка, як відаць, выпадкова трапіў на такі адказны пост.

Рашаючае значэнне адыгрывае разгортванне масава-растлумачальнай работы сярод насельніцтва і актывізацыя работы калгасных добраахвотных пажарных дружын. Кожны калгас, кожная вёска павінны мець сваю пажарную дружыну і не на паперы, а сапраўдную, баявую. Рашэнне Соўнаркома БССР аб арганізацыі добраахвотных калгасных пажарных дружын і зацверджаны ім статут дружын павінен ведаць кожны працоўны вёскі.

11 жніўня СНК БССР зацвердзіў інструкцыю аб мерапрыемствах па барацьбе з пажарамі і гэту інструкцыю неабходна шырэй растлумачыць сярод насельніцтва.

Лепш абавязана працаваць сетка пажарнай аховы НКВД. З яе байцоў і камандзіраў можна і неабходна вылучыць патрэбную колькасць агітатараў для растлумачальнай работы сярод працоўных. І, нарэшце, пажарныя каманды павінны стаць сапраўднымі цэнтрамі прафілактычнай работы, лабараторыямі вопыту паспяховай барацьбы з агнём і прычынамі, якія яго выклікаюць.

Наша рэспубліка мае і сродкі, і тэхніку, і людзей, каб поўнасцю прадухіліць пажары. Вопыт Асвейскага раёна, дзе партыйная арганізацыя і совецкія органы забяспечылі ліквідацыю пажараў, ярка пацвярджае поўную магчымасць ліквідацыі страт ад агню. Пакласці канец расхлябанасці і ідыёцкай бесклапотнасці — вось што патрабуецца ад кожнага гаспадарніка, ад кожнага партыйнага і совецкага кіраўніка ў горадзе і на вёсцы. Трэба зразумець, што парушэнне правіл пажарнай бязапаснасці, невыкананне пастаноў урада аб мерапрыемствах па ліквідацыі пажараў—антыдзяржаўная справа, прамое пасобніцтва ворагу.

Пара, даўно пара вывесці на чыстую воду тых, хто падмяняе сапраўдную барацьбу за ахову соцыялістычнай уласнасці ад агню траскучымі фразамі і пустой балбатнёй. Справа першаступеннай важнасці—трымаць у стане пастаяннай гатоўнасці сродкі барацьбы з агнём, узнімаць боездольнасць пажарнай аховы, умацоўваць яе надзейнымі, праверанымі кадрамі і тысячамі добраахвотнікаў-пажарнікаў.

Рашуча і назаўсёды ліквідаваць страты ад агню—адказная задача партыйных і совецкіх арганізацый Беларусі, усёй совецкай грамадскасці нашай рэспублікі.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ ФРОНТ

Паводле паведамлення агенцтва Гавас, у раёне на паўночны ўсход ад Гандэсы мяцежнікі прадпрынялі 26 жніўня чатыры лютых атакі на рэспубліканскія пазіцыі ля падножжа горнага масіва Партыда дэ Фогуанас. Гэтыя атакі рэспубліканскімі войскамі былі адбіты. У раёне Гандэсы мяцежнікі прабавалі адкрыць сабе праход на захад ад масіва Санта-Мадэлена. Гэта спроба аказалася такой-жа мала паспяховай, як і папярэдняя.

У сектары на поўнач ад ракі Эбро мяцежнікі прадпрынялі атаку ў раёне Трэмпа супроць рэспубліканскіх пазіцый, размешчаных на правым беразе ракі Абелья. Гэта атака была рэспубліканцамі адбіта.

Паводле паведамлення іспанскага міністэрства абароны ад 27 жніўня, рэспубліканскія войскі паспяхова адбілі атаку мяцежнікаў і інтэрвентаў на пазіцыі ў Піэдрас дэ Аоло.

У зоне ракі Эбро рэспубліканскія войскі прадаўжаюць аказваць энергічнае супраціўленне мяцежнікам. У выніку атак мяцежнікаў, прадпрынятых імі 27 жніўня на Сіера Аліха, яны панеслі цяжкія страты.

ЦЭНТРАЛЬНЫ ФРОНТ

Згодна афіцыяльнай зводкі іспанскага міністэрства абароны, на эстрамадурскім участку фронта прадаўжаецца наступленне рэспубліканскіх войск у раёне на поўдзень ад ракі Сухар. Рэспубліканскія часці пасля паспяховага бою занялі Сіера дэль Таросо (на паўночны ўсход ад Кабеса дэль Буэй) і прадаўжаюць сваё наступленне.

Рэспубліканцамі ўзята многа палонных, у ліку якіх адзін афіцэр. Захвачана таксама вялікая колькасць ваенных матэрыялаў.

На іншых фронтах становішча без змен. (БЕЛТА).

—о—

СТРАТЫ ФАШЫСЦКАЙ АВІЯЦЫІ У ІСПАНІІ

ПАРЫЖ, 28 жніўня. (БЕЛТА). Паводле паведамлення агенцтва Гавас, за час з 1 студзеня па 26 жніўня 1938 года рэспубліканцамі было збіта 405 фашысцкіх самалётаў. Рэспубліканцы страцілі за гэты час 87 самалётаў. (На працягу ўсяго 1937 года рэспубліканцы збілі 293 фашысцкія самалёты). Найбольш цяжкія страты авіяцыя інтэрвентаў панесла за апошнія месяцы. У ліпені інтэрвенты страцілі 90 самалётаў і з 1 па 26 жніўня—93 самалёты, у той час як рэспубліканцы ў жніўні страцілі толькі 18 самалётаў. Тры чвэрці ўсіх знішчаных фашысцкіх самалётаў былі збіты рэспубліканцамі ў час паветраных баёў.

Е. С. ЮДЗЕНКОВА — лепшая ільнацерабільшчыца Касцюковіцкай МТС. За 13 дзён на машыне «ВНІІЛ-5» тав. Юдзенкова выцерабіла 110 га ільну пры норме 50 га за сезон.
Фото Б. Вернера (СФ).

„ЭВР" АБ ГЕРМАНА-ІТАЛЬЯНСКІМ ПАГАДНЕННІ АБ ПАДЗЕЛЕ ІСПАНІІ

ПАРЫЖ, 27 жніўня. (БЕЛТА). Табуі ў «Эвр», спыняючыся на адказе генерала Франко на прапанову камітэта па неўмяшанню аб адкліканні замежных войск з Іспаніі, піша, што, па вестках англійскага ўрада, паміж Гітлерам і Мусаліні дасягнута пагадненне адносна ўстанаўлення германа-італьянскага панавання над Іспаніяй. Гэта пагадненне было дасягнута да таго, як генерал Франко адправіў свой адказ у Лондан. «Па атрыманых намі з Рыма вестках, — піша Табуі, — канчатковы план германскага і італьянскага панавання на Піранейскім паўвостраве прадугледжвае захаванне італьянскага панавання над Балеарскімі астравамі. Справа ідзе не аб фармальнай анексіі Балеарскіх астравоў, але аб устанаўленні поўнага панавання Італіі над гэтымі астравамі.

Згодна германа-італьянскага плана на працягу доўгага часу іспанскі ўрад меў-бы бок-аб-бок з сабой кансультацыйны камітэт, што складаецца з італьянцаў і германцаў, які з'явіўся-б фактычным правіцелем краіны. Іспанская армія павінна быць арганізавана вышэйшымі германскімі і італьянскімі афіцэрамі.

Германцы пры гэтым мелі-б некаторую перавагу ў сухаземнай арміі, у авіяцыі-ж перавага была-б прадастаўлена італьянцам. Інструктары, пілоты, наглядальнікі і т. д. складаліся-б з італьянцаў, атрымаўшых іспанскае грамадзянства.

Што датычыць эканамічных рэсурсаў Іспаніі — жалезных, свінцовых, медных і ртутных копей, чыгуначных, табачных манаполіі і т. д., то яны віраваліся-б міжнародным кансорцыумам, у якім прымалі-б удзел італьянцы, германцы і іспанцы. Іспанцы атрымалі-б у гэтым кансорцыуме ганаровыя пасады, але былі-б у ім у меншасці. Франка-англійская канкурэнцыя была-б радыкальна ўстранена.

План таксама прадугледжвае экспрапрыяцыю замежных эканамічных інтарэсаў у Іспаніі».

Абстрэл аўтамабіля італьянскага пасла пры „ўрадзе" Франко

АНТЫІТАЛЬЯНСКІЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ У САН-СЕБАСЦЬЯНЕ

ПАРЫЖ, 27 жніўня. (БЕЛТА). Агенцтва Эспань перадае аб меўшым месца 22 жніўня нападзе на аўтамабіль італьянскага пасла пры «ўрадзе» Франко, які адбыўся ля Сан-Себасцьяна. Аўтамабіль, у якім ехалі італьянскі пасол, яго жонка, сакратар і шофер, накіроўваўся па дарозе з Сан-Себасцьяна ў Бургос і адтуль ў Саламанку. Патруль фалангістаў загадаў шоферу спыніцца. Аднак машына прадаўжала рухацца па дарозе з ранейшай скорасцю. Патруль адкрыў па ёй агонь. Пасля гэтага аўтамабіль спыніўся, і італьянскі пасол, выйшаўшы з машыны, стаў промка абурацца нападам на аўтамабіль італьянскага прадстаўніка. Сабраўшыеся вакол аўтамабіля фалангісты і група штацкіх занялі яўна варожую ў адносінах пасла пазіцыю і ў адказ на яго крыкі адказвалі воклічамі: «Смерць італьянскім інтэрвентам!» У рэзультаце адбыўшагася замяшання жонка італьянскага пасла, раненая ў часе абстрэлу аўтамабіля, з вялікім спазненнем была дастаўлена ў пункт хуткай дапамогі, дзе яна неўзабаве памерла.

Італьянскі пасол патрабаваў ад улад Бургоса выдачы ў распараджэнне італьянскіх улад усіх вінаўных у абстрэле яго аўтамабіля. У сувязі з гэтым у Сан-Себасцьяне і ва ўсім раёне мелі месца антыітальянскія дэманстрацыі.

УНУТРЫПАЛІТЫЧНЫ КРЫЗІС У ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 27 жніўня. (БЕЛТА). Узбуджэнне, якое выклікала прамова Далад'е ў найшырэйшых працоўных масах Францыі, з наглядзінасцю паказала выключную папулярнасць праграмы народнага антыфашысцкага фронта. Працоўныя масы гатовы адстаяць дасягнутыя імі соцыяльныя заваяванні. Народны фронт прадаўжае жыць у сэнанні і імкненнях мас. Відавочна, у сувязі з гэтым учора на пасяджэнні парламенцкай групы радыкал-соцыялісцкай партыі Далад'е катэгарычна запэўніў, што ён не памышляе аб пошуках падтрымання свайму ўраду ў правых колах.

Лічаць, што ў сілу процідзеяння радыкалаў і хістаючайся пазіцыі ў дэлегацыі левых груп сёння не будзе прынята рашэнне аб неадкладным скліканні палаты дэпутатаў. Блюм учора заявіў, што ён «больш, чым калі-небудзь, з'яўляецца прыхільнікам стварэння ўрада нацыянальнага яднання вакол народнага фронта. Калі-б гэта было магчыма, то трэба было-б выклікаць неадкладна ўрадавы крызіс. Аднак такога становішча няма. Адсюль вывад, што нічога не трэба рабіць для таго, каб затрудніць урадавую дзейнасць».

«Юманітэ» па поваду пазіцыі, занятай главой французскага ўрада, піша ў перадавым артыкуле, што ў парушэнне закона аб 40-гадзінным рабочым тыдні Далад'е бачыць «адзіны сродак дабіцца давер'я з боку прадстаўнікоў буйнага капітала. Што значыць законнасць, што значыць яднанне французскага народа, так неабходнае перад тварам знешняй небяспекі? Далад'е пацвярджае, што ён нічога не прадпрыме супроць сабатажа буйнага капітала, але будзе дзейнічаць толькі супроць рабочага класа, супроць працоўнага народа.

Успамінаецца, што ў сакавіку гэтага года нападкі Шотана на прадстаўнікоў рабочага класа прывялі да крызіса, у часе якога Гітлер ажыццявіў анексію Аўстрыі. Ці не хочуць цяпер справакаваць соцыяльны крызіс у той самы момант, калі Гітлер адкрыта пагражае Чэхаславакіі?

Удар па народнаму фронту не можа служыць інтарэсам Францыі. Народ больш, чым калі-небудзь, аддан народнаму фронту».

Цыркулююць чуткі, быццам да пасяджэння ўрада, якое адбудзецца 30 жніўня, падрыхтаван ужо праект двух дэкрэтаў. Адзін з гэтых дэкрэтаў быццам-бы прадугледжвае магчымасць устанаўлення 48-гадзіннага рабочага тыдня ў ваеннай прамысловасці пры ўмове адпаведнага павышэння зарплаты. Другі дэкрэт быццам-бы прадугледжвае магчымасць давядзення да 44 гадзін рабочага тыдня ў прыватных прадпрыемствах, «не маючых магчымасці знайсці неабходную рабочую сілу на рынку працы».

АРЫШТ АГЕНТАЎ ГЕНЕРАЛА ФРАНКО Ў ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 28 жніўня. (БЕЛТА). Паліцыя арыштавала ў Парыжы чатырох асоб, якія перавозілі зброю для іспанскіх мяцежнікаў. У начальніка гэтых кантрабандыстаў, афіцэра-лётчыка, які назваў сябе Фійетам, быў выяўлен склад рознай зброі.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

За апошнія два дні на фронце ракі Янцзы адзначаецца значная актывізацыя кітайскіх войск. На паўночным беразе ракі кітайскія войскі затрымалі прасоўванне японскіх часцей і перайшлі ў рашучае контрнаступленне. 27 жніўня ў 9 гадзін раніцы японцы былі выбіты з горада Цяньшань. Прадаўжаючы цяснініь японцаў, кітайскія войскі ў 2 гадзіны дня занялі горад Тайху (на паўднёвы захад ад Аньціна). Японскія войскі, несучы вялікія страты, адступаюць да Аньціна. Атрад японскіх войск, які знаходзіцца ў Хуанмэі, адрэзан кітайцамі ад свайго тылу.

На паўднёвым беразе Янцзы лютыя баі прадаўжаюцца ў раёне Нанькана (на поўдзень ад Цзюцзяна). У гэтым раёне японцы прабавалі высадзіць дэсант колькасцю ў 400 чалавек. У трохгадзінным сражэнні японцы страцілі каля 200 чалавек забітымі, уключаючы камандзіра дэсанта. Пад націскам кітайскіх войск японцы адступілі. Кітайцы захапілі 4 кулямёты і некалькі дзесяткаў вінтовак. У баях пад Наньканам японцы шырока скарыстоўвалі ўдушлівыя газы. Аднак, як толькі газы рассеяліся, кітайскія войскі перайшлі ў контрнаступленне і некалькі прасунуліся наперад. У рэзультаце прымянення японцамі ўдушлівых газаў з кітайскіх часцей у тыл эвакуявана вялікая колькасць байцоў, паражоных газамі.

26 жніўня ў раёне баёў на Янцзы кітайская артылерыя затапіла 3 японскія транспарты.

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

У правінцыі Шаньсі калона японскіх войск, выступіўшая некалькі дзён таму назад з Лішы на захад, сустрэўшыся з рашучым супраціўленнем кітайскіх часцей, вымушана была вярнуцца ў Лішы. Кітайскія войскі, праследуючы японскую калону, падышлі да ваколіц горада, дзе зараз адбываюцца баі. Кітайцамі захоплен у палон японскі афіцэр, які камандаваў аперацыямі ў гэтым раёне.

На апошніх паведамленнях, у правінцыі Хэбэй 23 жніўня ў раёне Маньчэна (на паўночны захад ад Баодзіна) 400 салдат войск Манчжоу-Го, паўстаўшы супроць японцаў, перайшлі на кітайскую старану. Перайшоўшыя салдаты войск Манчжоу-Го ўключаны ў атрады кітайскай арміі.

—о—

СТАНОВІШЧА Ў ЧЭХАСЛАВАКІІ

ПРАГА, 27 жніўня. (БЕЛТА). Актыўная дзейнасць англійскай місіі лорда Рэнсімена прывяла да новых уступак чэхаславацкага ўрада. У апублікаваным сёння інтэрв'ю Годжа з карэспандэнтамі англійскіх газет афіцыяльна пацвярджаецца, што чэхаславацкі ўрад згадзіўся пры рэарганізацыі адміністратыўнага ўпраўлення рэспублікі «ўлічыць нацыянальны састаў таго або іншага раёна ці вобласці». Гэта азначае фактычнае раздзяленне рэспублікі на аўтаномныя нацыянальныя вобласці (кантоны). Мяркуецца, што пры ажыццяўленні новай адміністратыўнай рэформы будуць створаны тры або чатыры нямецкія вобласці. Але і гэта далёка ідучая ўступка не задавальняе генлейнаўцаў, дабіваючыхся, па заданню з Берліна, поўнага задаволення патрабавання аб тэрытарыяльнай «аўтаноміі».

Учора прэм'ер Годжа ўноў прыняў дэлегацыю генлейнаўскай партыі—Кундта і Рошэ. Іх гутарка, як і ранейшая, закончылася безрэзультатна. Дата новай нарады ўрада з дэлегацыяй генлейнаўскай партыі не вызначана.

Генлейнаўцы пры прамым патуранні Рэнсімена і яго місіі становяцца ўсё наглей і наглей.

Увесь учарашні дзень лорд Рэнсімен правёў у бесперапынных нарадах з генлейнаўцамі.

НОВЫЯ МАБІЛІЗАЦЫЙНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ГЕРМАНІІ

ПРАГА, 27 жніўня. (БЕЛТА). З паінфармаваных крыніц паведамляюць аб далейшых мабілізацыйных мерапрыемствах фашысцкай Германіі. Да 15 верасня (да тэрміна сканчэння сельскагаспадарчых работ) лік удзельнікаў, праходзячых у розных раёнах краіны манеўраў, дасягне 1.800 тысяч чалавек. Выдана афіцыяльнае распараджэнне аб затрыманні ў арміі асоб, тэрмін службы якіх канчаецца ў верасні гэтага года. У пагранічных з Чэхаславакіяй раёнах 15 верасня мабілізоўваюцца ўсе сялянскія коні, прыватныя аўтамабілі, скарачаецца рух аўтобусаў і пасажырскіх паездоў. Да аўстрыйскай і саксонска-баварскай граніц з Чэхаславакіяй спягваюцца новыя воінскія часці, пераважна танкавыя злучэнні і часці цяжкай і зенітнай артылерыі. На прадстаячым у дні нюрнбергскага з'езда германскай фашысцкай партыі парадзе будзе ўдзельнічаць 80 тысяч штурмавікоў, якія з Нюрнберга будуць накіраваны на манеўры.

Мабілізацыя рабочых на фартырфікацыйныя работы праводзіцца ўзмоцненымі тэмпамі. За апошнія два тыдні з Франкфурта-на-Майне адпраўлена на заходнюю граніцу 27 тысяч чалавек.

Ваеннае і гаспадарчае кіраўніцтва «Трэцяй імперыі» прымае тэрміновыя меры да пераводу ўсяго жыцця краіны на ваенныя рэйкі. Выступіўшы некалькі дзён назад на ваенным прадпрыемстве ў горадзе Мангейме прадстаўнік ваеннага міністэрства разгарнуў наступную праграму мерапрыемстваў у выпадку пачатку вайны: з першага дня вайны рабочыя ваеннай прамысловасці пераводзяцца на ваенны рэжым. Кіраўніцтва прадпрыемстваў пяройдзе ў рукі ваенных чыноўнікаў. За парушэнне іх загадаў рабочыя будуць аддавацца ваеннаму суду. Зарплата адмяняецца — рабочыя будуць атрымліваць ваенны паёк. Усе знаходзячыяся ў банках і ў ашчадкасах сродкі будуць канфіскаваны дзяржавай на патрэбы вайны. «Неблаганадзейныя» элементы будуць адпраўлены на фронт для капання акопаў, якое будзе рабіцца пад наглядам спецыяльных карных каманд.

На прадпрыемствах устанаўліваецца асобы ваенны кантроль, функцыі якога будуць выконваць пасты СС (ахоўныя атрады).

Шалёныя ваенныя прыгатаванні выклікаюць сур'ёзную трывогу і нездаволенне сярод усіх слаёў насельніцтва Германіі. Характэрна ўзмацненне нездаволення сярод салдат германскай арміі і прызваных рэзервістаў. На манеўрах у Саксоніі пасля прароблена-га на працягу 42 гадзін 125-кілометравага пераходу салдаты ўзбунтаваліся і патрэбавалі два дні адпачынку.

АБ ВЫКАНАННІ ПАСТАНОЎ СНК БССР АД 9 ЛІПЕНЯ І АД 8 ЖНІЎНЯ ПА ПЫТАННЮ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА 1939 ГОДА ПА МАГІЛЕЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

Адзначыць, што становішча падрыхтоўчых работ па перапісу насельніцтва 1939 г. па Магілеўскай вобласці прадаўжае аставацца нездавальняючым: не ўстаноўлена граніца горада Магілева, не ўпарадкаваны назвы вуліц і нумарацыя дамоў у горадзе Асіпавічы, у Дрыбінскім і Магілеўскім раёнах не ўдакладнены раённыя карты і не закончана праверка па-гаспадарчых кніг сельсовецкага ўліку. Да арганізацыі камісій садзейнасці перапісу прыступілі 8 раёнаў вобласці, з 20. Оргкамітэт не прыступіў да зацвярджэння кіруючых кадраў перапісу. Райвыканкомы зацвердзілі толькі 10 проц. патрэбнай колькасці кадраў перапісу.

Такое становішча падрыхтоўчых работ да перапісу насельніцтва з'яўляецца вынікам самаўхілення оргкамітэта ад кіраўніцтва работамі па падрыхтоўцы да перапісу насельніцтва.

Совет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Указаць старшыні оргкамітэта па Магілеўскай вобласці тав. Церахаву на поўную адсутнасць з яго боку кіраўніцтва падрыхтоўчымі работамі да перапісу насельніцтва і невыкананне пастаноў СНК БССР аб разгортванні падрыхтоўчых мерапрыемстваў да перапісу.

2. Абавязаць старшыню оргкамітэта па Магілеўскай вобласці забяспечыць непасрэдным кіраўніцтвам выкананне ўсіх падрыхтоўчых работ да перапісу насельніцтва па вобласці, заслухоўваючы абласное ўпраўленне народнагаспадарчага ўліку і райвыканкомы аб ходзе падрыхтоўкі.

3. Адзначаючы зусім недапушчальнае становішча з падборам і зацвярджэннем кадраў для правядзення перапісу па вобласці ў цэлым, абавязаць оргкамітэт прыняць меры, забяспечваючыя падбор і персанальнае зацвярджэнне кіруючых і масавых кадраў для перапісу насельніцтва ў тэрміны, устаноўленыя СНК СССР, прапанаваўшы райвыканкомам і горсоветам для гэтай мэты склікаць па-зачарговыя пасяджэнні прэзідыума.

4. Папярэдзіць тав. Церахава, што ў выпадку непрыняцця рашучых мер на працягу 5 дзён да выканання гэтай пастановы,—СНК БССР прыме адпаведныя меры ўздзеяння.

5. Абавязаць Упраўленне нарагаспуліку інфармаваць СНК БССР аб ходзе падбору і зацвярджэння кадраў перапісу 5, 15 і 25 верасня.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР—КІСЯЛЕЎ.

Кіраўнік справамі Совета Народных Камісараў БССР—МАНЫШЭЎ.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ПРОМФІНПЛАН

Менскі станкабудаўнічы завод імя Варашылава мае велізарнае значэнне ў развіцці машынабудаўніцтва ў БССР. Выпускаемыя заводам складаныя станкі ідуць на абсталяванне буйнейшых прадпрыемстваў Совецкага Саюза. Вось чаму ворагі народа, прабраўшыся да кіраўніцтва заводам, усякімі метадамі праводзілі падрыўную шкодніцкую работу. Яны зрывалі асваенне новых станкоў, свядома заблытвалі аплату працы рабочых і спецыялістаў, тармазілі разгортванне стаханаўскага руху і т. д. У выніку гэтага завод на працягу чатырох апошніх год не выконваў плана.

Партарганізацыя завода, узброеная рашэннямі лютаўска-сакавіцкага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказаннямі таварыша Сталіна, выкарчоўваючы ворагаў народа — трацкісцка-бухарынскіх шпіёнаў, вылучыла на кіруючую работу на вытворчасці дзесяткі партыйных і непартыйных большэвікоў, бязмежна адданых партыі Леніна—Сталіна.

Так, напрыклад, радавы рабочы-комуніст тав. Лібман вылучан начальнікам інструментальнага цэха. З першых дзён сваёй работы ён здолеў знішчыць недахопы, якія мелі месца ў гэтым цэху. Інструментальны цэх зараз ужо не з'яўляецца вузкім месцам завода. Кандыдат партыі тав. Крайко вылучан на адказны ўчастак ліцейнага цэха — брыгадзірам шышальнай брыгады. Дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву яго брыгада паказвае ўзоры прадукцыйнасці працы—яна стала суцэльна стаханаўскай. Добра працуюць вылучэнцы: майстар такарнага пралёта комуніст тав. Новікаў, кантрольны майстар ліцейнага цэха тав. Эстэркін і рад іншых.

Маладыя кадры — камандзіры вытворчасці па-большэвіцку ўзяліся за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва на заводзе. Яны вядуць барацьбу за перавыкананне вытворчай праграмы, за паляпшэнне якасці прадукцыі. Ім партыйная арганізацыя аказвае пастаянную дапамогу.

Вялікае значэнне ў рабоце вытворчасці мае правільнае спалучэнне гаспадаркі з палітыкай. Гэтыя два пытанні неадлучны адзін ад аднаго. Вось чаму партыйная арганізацыя завода, сістэматычна займаючыся пытаннямі вытворчасці, ні на мінуту не забывае аб разгортванні палітыка-выхаваўчай работы сярод калектыва рабочых. Партыйны камітэт шырока арганізаваў па цэхах і брыгадах агітацыйна-прапагандысцкую работу. У нас пастаянна праводзяцца гутаркі аб усіх важнейшых падзеях у краіне, а таксама па пытаннях міжнароднага становішча.

На аснове шырока разгорнутай палітыка-выхаваўчай работы і асабліва за час выбарчай кампаніі мы маем небывалы рост палітычнай актыўнасці рабочых. Гэта актыўнасць ужо сказваецца на рабоце вытворчасці. Завод зараз паспяхова выконвае вытворчую праграму. За 7 месяцаў 1938 года план па таварнай прадукцыі выканан на 105,5, а па валавой—на 105,8 процанта. На заводзе растуць рады стаханаўцаў. 65 процантаў усіх рабочых — стаханаўцы і ўдарнікі.

Комуністы завода ідуць у авангардзе. Усе 56 чалавек членаў і кандыдатаў партыі, якія працуюць непасрэдна на вытворчасці, з'яўляюцца стаханаўцамі. Працуючы ўзорна на вытворчасці, яны таксама вядуць вялікую партыйную і грамадскую работу. Вось, напрыклад, слесар рамонтнага цэха тав. Батвінкін. Ён з'яўляецца членам Сталінскага гораайкома КП(б)Б, працуе старшынёй цэхкома. Сваю праграму тав. Батвінкін выконвае на 180—200 проц. Комуніст тав. Малейка — арганізатар стаханаўскага руху ў механічным цэху. Ён, працуючы токарам, выконвае заданне на 200 процантаў. Вялікую ўвагу аддае і грамадскай рабоце, працуючы старшынёй цэхавага камітэта Каваль тав. Тэйф, маляр тав. Цофін, фармаўшчык тав. Акуліч—усё гэта знатныя людзі прадпрыемства, якія выконваюць заданне на 200—250 процантаў, а стары рабочы — член партыі — грузчык тав. Чэрчыс выконвае норму на 300—400 проц. Такіх людзей — стаханаўцаў — на заводзе не адзінкі, іх сотні. Усе яны выхаваны партыйнай арганізацыяй і па-большэвіцку змагаюцца за перавыкананне промфінплана.

Комуністы, стаханаўцы завода таксама павышаюць свой ідэйна-палітычны і агульнаадукацыйны ўзровень. Усе яны займаюцца ў партыйных школах і гуртках.

Вялікую ўвагу партыйная арганізацыя аддае вытворчым нарадам. На вытворчых нарадах завода шырока прымаюць удзел разам з комуністамі і беспартыйныя рабочыя-стаханаўцы. Партарганізацыя сочыць за тым, каб усе ўнесеныя прапановы, а таксама прынятыя рашэнні неадкладна ажыццяўляліся.

Па ініцыятыве партарганізацыі лепшыя стаханаўцы завода з ліку партыйных і непартыйных большэвікоў наведалі буйнейшыя станкабудаўнічыя заводы горада Масквы і Ленінграда. Там яны пазнаёміліся з дасягненнямі навейшай тэхнікі, а таксама пераняялі вопыт работы стаханаўцаў станкабудаўнічых заводаў імя Орджанікідзе і «Пролетарый».

Аднак, трэба адзначыць, што побач з дасягненнямі, якіх мы дабіліся за апошні час, у практыцы работы партарганізацыі яшчэ ёсць і недахопы. Галоўнае тое, што мы яшчэ не здолелі дабіцца таго, каб вопыт стаханаўскіх метадаў работы перадаваўся ўсім рабочым завода, каб усе прапановы рабочых, прынятыя на вытворчых нарадах, безадкладна ажыццяўляліся.

Партыйная арганізацыя, ведучы рашучую барацьбу за хутчэйшую ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, ставіць сваёй асноўнай задачай — дабіцца, каб увесь завод ператварыць у стаханаўскі.

Х. Л. РАКСІН,

сакратар парткома станкабудаўнічага завода імя Варашылава (Менск).

КОМСАМОЛЬЦЫ-ПАГРАНІЧНІКІ РЫХТУЮЦЦА ДА 20-ГОДДЗЯ ЛЕНІНСКАГА КОМСАМОЛА

У комсамольскіх арганізацыях часцей пагранічных і ўнутраных войск Беларускай акругі шырока разгарнулася падрыхтоўка да 20-годдзя Ленінскага комсамола. Маладыя патрыёты рыхтуюць дастойныя падарункі мацеры-радзіме. Усе комсамольцы падраздзяленняў часцей акругі, абмеркаваўшы пісьмо аўтазаводцаў, уключыліся ў соцспаборніцтва імя 20-годдзя Ленінскага комсамола.

У заключаных соцдагаворах комсамольцы-пагранічнікі абавязваюцца яшчэ больш узмацніць ахову дзяржаўных граніц павысіць баявую і палітычную падрыхтоўку, глыбока вывучыць гісторыю большэвіцкай партыі, прачытаць рад кніг мастацкай літаратуры, узмацніць абаронную работу сярод насельніцтва пагранічных раёнаў і падрыхтаваць варашылаўскіх стралкоў з калгаснікаў пагранічных калгасаў.

Курсант школы тав. Кірылаў (часць, дзе ваенкомам тав. Уткін) абавязаўся ў падарунак мацеры-радзіме закончыць школу толькі на выдатна. Курсант Чумакоў, з гэтай-жа часці, таксама абавязаўся закончыць школу на добра і выдатна і астацца на пажыццёвую службу ў пагранічных войсках.

Камандаванне часцей, падводзячы першыя вынікі соцспаборніцтва паміж падраздзяленнямі і асобнымі комсамольцамі, намеціла рад кандыдатаў на лошку гонару імя 20-годдзя Ленінскага комсамола. 7 кандыдатур ужо зацверджаны палітаддзелам пагранічных і ўнутраных войск акругі.

Сярод зацверджаных — малодшы камандзір-комсамолец, выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі, нядаўна прыняты ў кандыдаты партыі тав. Маёраў. Ён мае 8 заахвочанняў і дзве грашовыя ўзнагароды, з якіх адна ад наркома ўнутраных спраў БССР за затрыманне мацёрага шпіёна. Выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі чырвонаармеец тав. Захараў (з часці, дзе ваенкомам тав. Логвінаў) мае 10 заахвочанняў і тры затрыманні парушальнікаў граніцы, за што ўзнагароджан імянным гадзіннікам і грашыма. Чырвонаармеец тав. Піліпчук — выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі, які мае 5 затрыманняў. Тав. Піліпчук узнагароджан наркомам імянным гадзіннікам.

У выніку праведзенай палітычна-масавай работы сярод байцоў падраздзяленняў наглядаецца вялікі інтарэс да комсамольскай работы. У падраздзяленнях пачалася масавая падача заяў аб уступленні ў рады Ленінскага комсамола.

Да 20-годдзя Ленінскага комсамола многія падраздзяленні акругі прыходзяць поўнасцю комсамольскімі.

ЛЕПШЫЯ КОМСАМОЛЬЦЫ УСТУПАЮЦЬ У РАДЫ ПАРТЫІ

Партыйная арганізацыя вайсковай часці, дзе сакратаром партыйнага бюро тав. Кудраўцаў, за 7 месяцаў г. г. прыняла ў свае рады 26 комсамольцаў, з якіх 15 лепшых малодшых камандзіраў.

У рады партыі ўступаюць лепшыя людзі часці. Вось, напрыклад, у кандыдаты партыі прынят баец тав. Сокалаў. За перыяд сваёй службы ў РСЧА ён значна вырас палітычна і зараз выбран адказным сакратаром комсамольскага бюро часці. Прынят у партыю таксама малодшы камандзір, намеснік палітрука тав. Аносаў, які з'яўляецца выдатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Яму комсамольцы даверылі ўзначальваць комсамольскую арганізацыю палкавой школы.

Партыйная арганізацыя з новапрынятымі вядзе выхаваўчую работу. Яны навучаюцца ў школах і гуртках партыйнай асветы, вывучаюць гісторыю большэвіцкай партыі і гісторыю народаў СССР. Гэтым людзям даручаюцца асобныя ўчасткі партыйнай і грамадскай работы.

Некалькі лепшых комсамольцаў-выдатнікаў баявой і палітычнай вучобы тт. Чухненка, Іваноў, Кабанаў і іншыя падрыхтоўваюць сябе для ўступлення ў рады ВКП(б).

Строга захоўваючы прынцып індывідуальнага адбору, партарганізацыя папаўняе свае рады за лік лепшых комсамольцаў, стойкіх барацьбітоў за справу Леніна—Сталіна.

А. ЛЮБІМЦАЎ.

Дэпутат Вярхоўнага Совета БССР—старшыня калгаса «Чырвоны баец», Бабруйскага раёна, член КП(б)Б тав. У. І. Прахаренка (другая злева) гутарыць з нядаўна прынятымі ў кандыдаты КП(б)Б тт.: Е. Т. Голуб—брыгадзір калгаса «Партызан», У. І. Прахаренка, У. А. Гутоўскай — нам. старшыні калгаса імя Кірава, В. Л. Шчэгловым — сакратар Бортнікаўскага сельсовета, Д. Ф. Казлоўскім—старшыня калгаса і Т. А. Пракопчык—старшыня Варатынскага сельсовета. Фото Л. Мазелева (СФ).

КУРСЫ ДАКЛАДЧЫКАЎ ПА МІЖНАРОДНЫХ ПЫТАННЯХ

27 жніўня пры менскім Доме партактыва пачалі працаваць 10-дзённыя курсы для дакладчыкаў па міжнародных пытаннях. Курсы разлічаны на 75 чалавек партыйнага актыва Менска і Менскай вобласці. Слухачы курсаў прапрацуюць тэмы: наспяванне новага эканамічнага крызіса, націск агрэсараў і пагроза новай сусветнай вайны (замежная і ўнутраная палітыка фашысцкай Германіі, Італіі, Польшчы і Японіі), барацьба кітайскага і іспанскага народаў супроць фашысцкіх інтэрвентаў, замежная палітыка СССР і барацьба за мір, аб каварных метадах замежных разведак і іх трацкісцка-бухарынскіх агентаў.

Лекцыі па другой тэме на курсах чытае прафесар ваенна-паветранай Акадэміі тав. Пухоўскі.

ДА ЮБІЛЕЮ ВЯЛІКАГА ПАЭТА-РЭВОЛЮЦЫЯНЕРА

У сакавіку 1939 года вялікі украінскі народ разам з усімі братнімі народамі Совецкага Саюза будзе святкаваць 125-гадовы юбілей з дня нараджэння паэта Тараса Рыгоравіча Шэўчэнка—найвялікшага паэта, рэволюцыянера-дэмакрата.

Народы СССР, якія выраслі пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, дзякуючы ажыццяўленню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, пры штодзённых клопатах свайго бацькі, настаўніка і правадыра—вялікага Сталіна, атрымаўшыя шчаслівае, радаснае жыццё, з надзвычайнай увагай вывучаюць творы геніяльных паэтаў усіх народаў, з бязмежнай пашанай шануюць памяць гэтых людзей. У мінулым годзе наша радзіма святкавала два вялікіх, слаўных юбілеі — юбілей Александра Сяргеевіча Пушкіна і юбілей Шота Руставелі. Мы знаем, што імя Тараса Рыгоравіча Шэўчэнка побач з гэтымі выдатнейшымі геніямі чалавецтва. Творы Шэўчэнка, як і творы Пушкіна і Руставелі, вядомы шырачэйшым масам Совецкага Саюза.

Комуністычная партыя, совецкая ўлада, вялікі Сталін далі народам магчымае, культурнае жыццё, далі ўсе магчымасці для выяўлення талантаў з народу, для іх жыцця і працы. На кожным кроку мы бачым рост нашых дараванняў і як далёка процілегла, як чорная ноч супроць яснага сонечнага дня, стаіць цяжкае жыццё вялікага паэта Тараса Рыгоравіча Шэўчэнка ў часы самаўладства. Царызм душыў яго ўсё жыццё, і толькі дзякуючы непамернай сіле свайго генія Тарасу Рыгоравічу праз ланцугі царскага самаўладства ўдавалася гаварыць з народам сваім цудоўным, бунтарскім словам.

Нарадзіўся Тарас Рыгоравіч 25 лютага 1814 года ў сяле Морынцы, Звенігародскага павету, у сям'і прыгоннага селяніна. У адзінаццацігадовага Шэўчэнка памірае бацька, і ён астаецца сіратой. Многа пакутваў Шэўчэнка, каб пражыць, — пас сялянскую жывёлу, працаваў парабкам у папа.

Пятнаццацігадовым Тараса Рыгоравіча Шэўчэнка забіраюць як прыгоннага ў панскі двор да пана Энгельгарда. Там яго вучылі паварчуком, а пасля паставілі прыслугоўваць «казачком» пану. Поўныя гора і адчаю юнацкія годы найвялікшага паэта. Прыезд у Пецербург, нявольніцкая работа ў мастака Шыраева. Пасля знаёмства з вялікімі мастакамі — вучоба ў Карла Брулава. Брулаў, зацікавіўшыся таленавітым юнаком, малюе партрэт Жукоўскага, партрэт разыгрываецца за 2500 рублёў праз латарэю. І за гэтыя грошы Тарас Рыгоравіч Шэўчэнка выкупляецца ў пана на волю. Вызвалены Тарас Рыгоравіч зараз-жа пяе цудоўную, магутную песню аб сваім народзе. У 1840 годзе невялічкай кніжкай выходзіць «Кабзар» Шэўчэнка. Яго слова заве народ да барацьбы з самаўладствам. У 1847 г. царская жандармерыя арыштоўвае яго. Вось паведамленне кіеўскага губернатара Фундуклея:

«III аддзяленне ўласнай яго імператарскай вялікасці канцылярыі.

У ліку асоб, на якіх па атрыманаму мной прадпісанню ад п. кіеўскага ваеннага, падольскага і валынскага генерал-губернатара звернута была ўвага, указан быў мастак С. Пецярбургскай акадэміі Тарас Рыгоравіч Шэўчэнка.

Мастак гэты пры звароце з Чэрнігаўскай губерні быў затрыман учорашняга чысла ля ўезда ў гор. Кіеў і прадстаўлен прама да мяне. Паміж папер яго аказалася рукапісная кніга з маларасійскімі ўласнага яго твору вершамі, з якіх многія абураючага і злачыннага зместу. Чаму, як гэтыя, так і ўсе іншыя, аказаўшыеся ў Шэўчэнка вершы, роўна прыватную яго перапіску я палічыў абавязкам прадставіць у III аддзяленне ўласнай яго імператарскай вялікасці канцылярыі.

Разам з гэтым суправаджаецца і мастак Шэўчэнка пад строгім караулам пры адным паліцэйскім афіцэры і адным радавым жандары. Грамадзянскі губернатар Фундуклей».

Высачэйшы прысуд адбыўся хутка. Шэўчэнку выслалі ў Орскую крэпасць, у Оранбург і залічылі ў салдаты. Нікалай I уласнаручна напісаў на прыгаворы: «пад стражэйшы нагляд з забаронай пісаць і маляваць».

Але геніяльны паэт і ў такіх умовах пісаў і ганьбіў самадзяржаўе. Рускія рэволюцыянеры-дэмакраты высока цанілі Шэўчэнку. Чэрнышэўскі так пісаў пра Тараса Рыгоравіча:

«Маючы цяпер такога паэта, як Шэўчэнка, маларасійская літаратура не мае патрэбы ні ў чыёй прыхільнасці».

Дабралюбаў таксама пісаў аб вялікім паэце:

«..Ён — паэт зусім народны, такі, якога мы не можам указаць у сябе. Нават Кальцоў не ідзе з ім у параўнанне, таму, што складам сваіх мыслей і нават сваімі імкненнямі часам аддаляецца ад народа. У Шэўчэнкі, насупроць, увесь круг яго дум і спачуванняў знаходзіцца ў поўнай адпаведнасці з сэнсам і са строем народнага жыцця. Ён вышаў з народа, жыў з народам і не толькі мыслію, але і акалічнасцямі жыцця быў з ім моцна і кроўна звязан».

Шэўчэнка—нястомны барацьбіт супроць прыгонніцтва. Яго геніяльнае слова спявалася шырокімі масамі. Дарма буржуазныя нацыяналісты хацелі па-свойму тлумачыць паэзію Шэўчэнка, паэзія Шэўчэнка — паэзія рэволюцыянера-дэмакрата, паэзія украінскага народа. Не гледзячы на забарону яго твораў царскай цэнзурай, творы яго шырока разыходзіліся ў народзе. Яны вусна перадаваліся ад аднаго к другому. Многія песні Шэўчэнка спяваліся ў нас у Беларусі.

Але ніколі творчасць Шэўчэнка не магла мець такога шырокага распаўсюджвання, як пры совецкай уладзе. Мільённыя тыражы на дзесятках моў разыходзяцца вельмі хутка. Юбілей Шэўчэнка — свята ўсяго совецкага, многамільённага народа. На Совецкай Украіне створана ўрадавая камісія па святкаванню юбілея Шэўчэнка. Створана камісія і пры Саюзе совецкіх пісьменнікаў СССР. Працоўныя Совецкай Беларусі з вялікай урачыстасцю будуць звяткаваць гэты слаўны юбілей. Мы павінны зараз-жа пачаць падрыхтоўку да юбілея. Паэты Совецкай Беларусі канчаюць пераклад усёй паэзіі Шэўчэнкі на беларускую мову. Трэба, каб Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі добра падрыхтавалася да выдання твораў Шэўчэнка. Саюз мастакоў павінен лічыць за гонар—мастацкае афармленне твораў Шэўчэнка, і за гэту работу трэба брацца зараз. Неабходна і выданне выбраных твораў у школьнай серыі. Крытычнай секцыі Саюза пісьменнікаў трэба выдаць зборнік артыкулаў, прысвечаны Шэўчэнку, у якім распрацаваць такія тэмы, як скажам: «Шэўчэнка і беларуская паэзія» і др. Інстытут літаратуры Акадэміі навук і Саюз совецкіх пісьменнікаў павінны неадкладна падрыхтаваць дакладчыкаў і загадзя арганізаваць іх выступленне на прадпрыемствах, у калгасах і т. д.

Дзяржаўнаму хору трэба развучыць песні Шэўчэнка. Трэба пачаць таксама асвятленне падрыхтоўкі да юбілея ў нашым друку.

Янка КУПАЛА, Якуб КОЛАС, Пятрусь БРОВКА.

Капітан СЦЕЖЭНКА

ШТО АДБЫЛОСЯ Ў РАЁНЕ ВОЗЕРА ХАСАН?

★

(Запіскі ўдзельніка баёў)

★

Пасьецкі раён, самая паўднёвая частка Далёкаўсходняга Прымор'я, мала вядомы ў заходняй частцы Совецкага Саюза, аднак ён мае вельмі важнае значэнне. Тут выходзяцца граніцы СССР, Манчжурыі і Карэі.

Наша граніца з поўдня на поўнач спачатку праходзіць па рацэ Тумень-Ула, аддзяляючы совецкую тэрыторыю ад Карэі. Працягнуўшыся так каля 25 кілометраў, граніца з Карэяй пераходзіць у граніцу з Манчжурыяй і адступае ад ракі. У гэтым месцы паміж СССР і Карэяй уклініваецца доўгім вузкім языком тэрыторыя Манчжурыі.

Пагранічны ўчастак Пасьецкага раёна багаты нізінамі і азёрамі. Адно з азёр за апошні час стала вядома ўсяму свету. Гэта — возера Хасан з прылягаючымі да яго з захада высотамі Заазёрнай (Чанкуфын) і Безымяннай, дзе совецкія пагранічнікі і войскі Прыморскай 1-й арміі на працягу 12 дзён вялі ўпорныя баі з японскімі захватчыкамі, пасягнуўшымі на недатыкальнасць совецкай тэрыторыі.

Чаму японская ваеншчына выбрала для новай узброенай авантуры раён возера Хасан?

Адказ на гэта пытанне трэба шукаць у характары мясцовасці і асаблівасцях тапаграфіі Пасьецкага раёна.

Возера Хасан і размешчаная каля яго града вышынь, або сопак, як іх называюць у нас у Прымор'і, знаходзіцца ўсяго ў 10 кілометрах ад берагоў Ціхага акіяна, а па прамой — у 130 кілометрах ад Владзівастока.

Калі ля Владзівастока граніца адстаіць ад узбярэжжа яшчэ параўнаўча далёка, кілометрах у 60 — 70, то чым далей на поўдзень, тым усё бліжэй і бліжэй падыходзіць яна да берага Японскага мора. Тут мясцовасць прадстаўляе сабой вузкую прыбярэжную паласу, скрозь балоністую і нізінную, дзе рух магчым толькі па намногіх сцежках і прасёлачных дарогах. Далей на поўнач, аж да Владзівастока, усё ўзбярэжжа складае таксама нізінная, якая шырока адкрываецца перад вачыма з нешматлікіх сопак, якія ўзвышаюцца над балоністай раўнінай.

Такімі сопкамі, адкрываючымі від на Пасьецкі заліў, з'яўляюцца вышыні Заазёрная (Чанкуфын) і яе суседка з поўначы — Безымянная, па вяршынях якіх праходзіць граніца, устаноўленая Хунчунскім дагаворам.

Як Заазёрная, так і Безымянная складаюць вяршыні аднаго і таго-ж скалістага кража, які спускаецца па наш бок граніцы прама ў возера Хасан.

Хаця абедзве сопкі і невысокія (Заазёрная мае ў вышыню каля паўтараста метраў), але ва ўмовах акружаючай роўнай мясцовасці ў яснае надвор'е з іх відаць ўсё наша ўзбярэжжа. Нашы пагранічнікі ва ўдачныя дні, калі рассейваюцца вельмі частыя тут туманы, у бінокль наглядаюць і бераг і дальнія астравы, раскіданыя ўздоўж узбярэжжа на шляху да Владзівастока.

Калі-б японцы ўтрымалі ў сваіх руках гэтыя вышыні, то іх умапаванні, наглядальныя пункты і агнявыя сродкі, размешчаныя на сопках, далі-б ім магчымасць трымаць пад наглядам і прамым агнём увесь участак нашай тэрыторыі на поўдзень і захад ад заліва Пасьет. А абгрунтуйся японцы на вышынях, яны непасрэдна пагражалі-б і нашай бухце Пасьет і ўзбярэжжу ў напрамку да Владзівастока.

Пачынаючы сваю авантуру, японская ваеншчына разлічвала на забяспечаны поспех. Яе супакойваў выключна цяжкі для нашай абароны характар мясцовасці, прылягаючай да возера Хасан. Адразу-ж за сопкамі Заазёрнай і Безымяннай, калі ісці ад граніцы ўглыб нашай тэрыторыі, ляжыць возера Хасан, выцягнутае на 4—5 кілометраў з поўначы на поўдзень уздоўж граніцы. Яго паўночны і паўднёвы краі знаходзяцца ад граніцы на адлегласці якіх-небудзь 150—200 метраў. Такім чынам, абедзве сопкі аддзелены ад астатняй совецкай тэрыторыі шырокай водная перашкодай, абыйсці якую на шляху к сопкам можна толькі ў непасрэднай блізасці ад граніцы па двух вельмі вузкіх праходах.

Кожнаму зразумела, якія вялікія перавагі гэта давала японскім войскам нацэліўшымся на сопкі, і якія цяжкасці стварала для нас.

Японцы разлічвалі, несумненна, таксама і на тое, што балоністая мясцовасць і абмежаваная колькасць дарог не дадуць нам магчымасці скарыстаць танкі і падвезці цяжкую артылерыю.

Як у выніку высветлілася, японцы загадзя рыхтаваліся да пагранічнага нападу. 19-я японская дывізія, размешчаная ў паўночнай, прыгранічнай, частцы Карэі, была адмабілізавана і знаходзілася ў паставе ваеннага часу, у колькасці не менш 20 тысяч чалавек. К раёну нападу былі падцягнуты цяжкая, зенітная артылерыя і бронепаязды.

Японская ваеншчына прадукушала поспех сваіх планаў, будуючы іх на ўліку вялікіх труднасцей, уставаўшых перад намі ў абароне совецкіх рубяжоў на подступах да Пасьета.

Але ў сваіх разліках японцы жорстка памыліліся. Чырвоная Армія, выпеставаная партыяй Леніна—Сталіна, выхаваная, як і ўвесь совецкі народ, на перамаганні любых труднасцей, яшчэ раз паказала ўсяму свету, што няма такіх крэпасцей, якія большэвікі не маглі-б узяць!

* * *

Застрэльшчыкамі нападу былі японскія пагранічныя атрады. Цёмнай і туманнай ноччу 28 ліпеня каля роты японскіх пагранічнікаў скрыта сканцэнтраваліся ў схілах сопак Заазёрная і Безымянная па свой бок граніцы. 29 ліпеня днём яны раптоўна атакавалі Безымянную. У гэты час на Безымяннай знаходзіўся наш пагранічны нарад у саставе адзінаццаці чалавек.

Не гледзячы на яўную перавагу сіл на баку японцаў, пагранічнікі сустрэлі нападаючых рашучым адпорам. Завязаўся жорсткі бой, які перайшоў у рукапашную схватку. Пагранічнікі, адбіваючы наваліўшагася ворага штыкамі і прыкладамі, драліся да апошняй магчымасці. Пяць чалавек з састава нашых байцоў былі забіты, а астатнія ранены. Не маючы сіл больш утрымліваць вышыню, пагранічнікі былі вымушаны яе пакінуць.

Пачуўшы перастрэлку, да месца бою выступіў рэзерв пагранічнага атрада; штыковай атакай і гранатамі японцы былі адкінуты з Безымяннай. Яны адышлі за граніцу, пакінуўшы на нашым баку сваіх забітых.

З самага пачатку вылазка японцаў пацярпела няўдачу. Ім патрэбаваліся дадатковыя сілы і некаторы час на сканцэнтраванне. На наступны дзень—30 ліпеня каля возера Хасан было спакойна. На грэбнях сопак былі размешчаны нашы пагранічныя пасты.

31 ліпеня перад самым досвіткам, калі густы туман акутваў мясцовасць да самых вяршынь сопак, японцы зрабілі новы напад. На гэты раз яны атакавалі абедзве вышыні — і Безымянную і Заазёрную. Цяпер з іх боку дзейнічалі ўжо не пагранічныя атрады, а палявыя войскі з вялікай колькасцю кулямётаў, мінамётаў і артылерыі. Як пасля было ўстаноўлена па забітых, японцы кінулі ў атаку два пяхотныя палкі 19-й дывізіі, падтрыманыя моцным артылерыйскім агнём.

Хлынуўшыя праз граніцу японскія войскі сутыкнуліся з нашымі пагранічнымі часцямі. Увесь дзень 31 ліпеня і 1 жніўня бой у раёне возера не спыняўся. Пагранічнікі паражалі японцаў агнём сваіх кулямётаў, штыкамі і ручнымі гранатамі. Нават будучы раненымі, байцы аставаліся ў страі, адмаўляючыся ад накіравання ў тыл і прадаўжаючы мужна драцца з ворагамі. Аднак перавага ў сілах была на баку японцаў; пракладваючы сабе дарогу цаной вялікіх страт, усцілаючы шлях забітымі і раненымі, японцы адцяснілі нашых пагранічнікаў і пранікілі ўглыб совецкай тэрыторыі да 4 кілометраў.

Захваціўшы Безымянную і Заазёрную, японцы пачалі іх паспешна ўмацоўваць, рабіць акопы і ствараць розныя перашкоды. Яны скарысталі камяністыя схілы сопак, размясцілі ўкрыта свае кулямёты і артылерыю, за асобнымі камнямі размясцілі снайпераў. Абедзве вышыні былі ператвораны ў аснову японскай абароны на возеры Хасан. Агонь кулямётаў з сопак і артылерыі, сканцэнтраванай за імі, запіраў адзіныя подступы да вышынь з поўначы і поўдня між граніцай і возерам.

Наша камандаванне, сустрэўшыся з фактам уводу японцамі ў бой палявых войск, загадала палявым часцям Чырвонай Арміі выступіць на падтрымку пагранічнікаў і знішчыць захватчыкаў, якія нагла ўварваліся на совецкую тэрыторыю. Адначасова з гэтым найстражэй было загадана не пераходзіць граніцы.

Наш полк, які знаходзіўся ў адлегласці каля пераходу ад раёна баёў, атрымаў загад аб неадкладным выступленні. Галаўны батальён форсіраваным маршам рушыўся да возера Хасан, за ім следвалі астатнія батальёны.

2 жніўня палявыя часці войск 1-й арміі, размешчаныя у Пасьецкім раёне, уступілі ў бой з захватчыкамі. Быў туманны дзень, марасіў дождж. Працяглы адкрыў ураганны артылерыйскі агонь. Аднак гэта не магло нас спыніць. Дружным націскам пагранічных часцей і палявых войск прапіўнік быў адкінут за возера Хасан. Позна вечарам нашы войскі наблізіліся да занятых японцамі сопкаў Заазёрная і Безымянная.

Японцы знаходзіліся ў надзвычайна выгодных тактычных умовах. Перад іх пазіцыямі ляжала возера, якое не дазваляла нам атакаваць вышыні з фронта. Для таго, каб выгнаць ворага

НА КАЛГАСНЫХ ПАЛЯХ

ПРАПУСКАЮЦЬ ЛЕПШЫЯ ТЭРМІНЫ СЯЎБЫ

ГЛУСК. Праходзіць самы добры час сяўбы азімых культур. А ў раёне сеяць не спяшаюцца. Па меркаваннях загадчыка райза тав. Говара і старшага агранома тав. Дуброўскага, на 25 жніўня пасеяна ўсяго 15 ці 40 гектараў.

Калгас «Беларуская вёска», Азямлянскага сельсовета, яшчэ не падрыхтаваў 170 гектараў глебы пад азімыя. Старшыня калгаса тав. Равінскі думае ўсю сяўбу на плошчы ў 200 гектараў правесці ўаднавор. Глеба, на якой сеюць жыта і пшаніцу, не ўгноена, а прызначанае калгасу мінеральнае ўгнаенне ляжыць на станцыі. Ігнаруецца радковая сяўба. У калгасе пачалі сяўбу ўручную, а радковая сеялка МТС не скарыстоўваецца.

У калгасах «Праўда», «VIII з'езд Советаў», Азямлянскага сельсовета, «Ударнік», імя Фрунзе, Гапкага сельсовета, становішча такое-ж, як і ў калгасе «Беларуская вёска», хіба толькі з тою розніцай, што тут яшчэ зусім да сяўбы не прыступалі. Да гэтага часу ні адзін калгас Гапкага сельсовета (старшыня Курылаў) не вывез са станцыі мінеральнае ўгнаенне, якое патрэбна скарыстаць на ўгнаенне глебы пад азімыя культуры.

У правядзенні азімай сяўбы бяздзейнічаюць усе тры МТС раёна.

— Ці працуюць у вас радковыя сеялкі? — звярнуліся мы да часова выконваючага абавязкі дырэктара Рудабельскай МТС тав. Руфера.

— Не, — быў адказ, — заўтра будуць працаваць.

Аказалася, што і назаўтра з 11 сеялак ні адна не вышла ў поле. Не працуюць радковыя сеялкі Глускай МТС і МТС імя 20-годдзя Кастрычніка.

Многія калгасы не маюць магчымасці пачаць сяўбу таму, што не абмянялі сваё звычайнае зярно на сартавое насенне. Аб сортаабмене ў раёне загаварылі 23 жніўня. Толькі ў гэты дзень райза скончыў складаць планы міжкалгаснага сортаабмену.

Да апошняга часу райза не паведаміў калгасы аб тым, што насенне жыта і пшаніцы трэба прадставіць для праверкі. Цяпер выясняецца, што яшчэ 42 калгасы не даслалі насення.

З боку райза няма сапраўднага большэвіцкага кіраўніцтва правядзеннем азімай сяўбы. Усе аграномы сядзяць у Глуску. А ім зараз абавязкова трэба быць на ўчастках.

Нядаўна Палескі абком КП(б)Б за правал усіх палітычна - гаспадарчых кампаній выключыў з партыі і зняў з работы былых першага сакратара райкома партыі і старшыню РВК. Але з гэтага факта новае кіраўніцтва раёна пакуль-што не зрабіла належных вынадаў.

Р. СЯРГЕЕНКА.

ЗРЫВАЮЦЬ СІЛАСАВАННЕ КАРМОЎ

Сілос з'яўляецца каштоўнейшым кармом для жывёлы. Але гэтага, відаць, не разумеюць кіраўнікі МТС і райза Быхаўскага раёна. Аб гэтым сведчаць наступныя факты.

За выключэннем калгаса імя Сталіна Макранскага сельсовета і імя Варашылава Студзеніцкага сельсовета ні адзін калгас раёна не прыступіў да сіласавання. З 8.900 тон, прадугледжаных планам, засіласавана толькі 86 тон. Калгасы імя Дзімітрава і імя Стаханава, Студзеніцкага сельсовета, нават не прыступілі да падрыхтоўкі сілосных ям.

Работнікі райза глядзяць на зрыў кармавой базы, як на штосьці зусім законнае. Старшы заатэхнік тав. Ванюшаў зусім спакойна заяўляе:

— Мы склікалі старшынь калгасаў гаварылі, што трэба сіласаваць, але яны не сіласуюць. Што-ж мы можам зрабіць?

Такое самасупакаенне існуе і ў адказных работнікаў МТС. Зусім не выпадкова, што па Лудчыцкай МТС (дырэктар Баліткін) і па Кузькавіцкай (дырэктар Таміла) ні адзін калгас не распачаў сіласавання.

Сіласарэзкі ў раёне зусім не скарыстоўваюцца. Днямі быў гакі выпадак. Старшыня калгаса «Новае жыццё» Клетнянскага сельсовета тав. Еўдакімаў звярнуўся з просьбай у Быхаўскую МТС, каб яму далі сіласарэзку. Ад работнікаў МТС паследваў адказ:

— Сіласарэзку не дадзім, бо вы не нашай МТС.

А тымчасам сіласарэзкі прастойваюць.

У калгасе «Кім» 1-га Грудзінаўскага сельсовета ёсць свая сіласарэзка, ёсць усё неабходнае, каб хутка выканаць план сіласавання. Не глядзячы на ўсе гэтыя ўмовы, тут з патрэбных 120 тон не засіласавана ні адной тоны.

Гэтыя факты добра вядомы райкому партыі і райвыканкому. Але раённыя арганізацыі не прымаюць мер, каб ліквідаваць такое ганебнае становішча.

Г. ПАУЛАЎ.

НОВЫЯ ІЛЬНАЎБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ

На калгасных палях праводзілася выпрабаванне новых ільнаўборачных машын. Вялікае гаспадарчае значэнне мае выпрабаванне ільняных камбайнаў. Гэтыя машыны робяць адначасова церабленне, ачоску галовак раслін і звязку снапоў. Выпрабаванне паказала, што ільняныя камбайны паскараюць працэс уборкі, даюць вялікую эканомію рабочай сілы і да мінімума зводзяць страты саломы і семя (галовак раслін). Паскарэнне працэса ўборкі намнога павышае каштоўныя якасці валакна.

Былі таксама выпрабаваны 4 ільнацерабілкі са снопавязальнымі апаратамі канструктараў Вышлова і Югава. На адной з машын быў прыменен працуючы на звычайным шпагаце вузлавязальнік тав. Югава—рабочага-вынаходца Люберэцкага завода. Выпрабаванне паказала, што па канструкцыі, прадукцыйнасці і прастаце новы вузлавязальнік намнога пераўзыходзіць «Дирринг».

Машыннае церабленне ільну праводзіцца ў нас галоўным чынам ільнацерабілкамі «ВНІІЛ-5». З гэтага года шырока распаўсюджваецца больш удасканаленая машына «ЛТ-7» Люберэцкі завод выпускае іх 2500 штук. Стаханавец тав. Пятроў на ільнацерабілцы «ЛТ-7» устанавіў усесаюзны рэкорд машыннага цераблення: за 20 дзён ён убраў звыш 250 гектараў ільну. Інжынер А. С. Маят для трактара СТЗ НАІІ сканструяваў новую 12-секцыйную машыну. Шырыня захвату новай ільнацерабілкі на 2 метры больш «ЛТ-7». Выпрабаванне паказала пераўзыйдзеную якасць гэтай машыны. Прадукцыйнасць яе—15—20 гектараў у дзень.

Паспяхова прайшло выпрабаванне ільнаачоснай машыны, вынайдзенай калгаснікам тав. Кір'янавым. Прадукцыйнасць гэтай машыны, працуючай ад коннага прывода, — 1200 — 1500 снапоў у гадзіну. Машына Кір'янава можа быць скарыстана ва ўсіх раёнах, як неабходнае дапаўненне да ільнацерабілак.

ДА ТРЭЦЯЙ ГАДАВІНЫ СТАХАНАЎСКАГА РУХУ. Стаханавец-двухсотнік гокар Неўскага машынабудаўнічага завода імя Леніна (Ленінград) Д. І. Владаміраў у гонар трохгоддзя стаханаўскага руху выканаў сярэднюю норму за першую палавіну жніўня на 400 проц. НА ЗДЫМКУ — т. Д. І. Владаміраў. (СФ).

НАСУСТРАЧ ТРЭЦЯЙ ГАДАВІНЫ СТАХАНАЎСКАГА РУХУ

МНОЖАЦЦА ПОСПЕХІ СТАХАНАЎЦАЎ

Новымі вытворчымі поспехамі сустракае трэцюю гадавіну стаханаўскага руху калектыў рабочых менскай абутковай фабрыкі імя Тэльмана. Асабліва добрых поспехаў у рабоце дасягнулі суцэльныя стаханаўскія брыгады.

Арганізаваная ў загатовачным цэху комсамольска-маладзёжная брыгада імя 20-годдзя ленінска-сталінскага комсамола выканала ліпеньскі вытворчы план на 110 проц. Усе рабочыя брыгады з'яўляюцца стаханаўскімі і ўзялі на сябе абавязацельства сістэматычна выконваць свае нормы не менш чым на 150 проц. Сваё абавязацельства стаханаўцы з гонарам выконваюць. Стаханаўка брыгады, комсамолка тав. Заяц выконвае норму на 220—230 проц., Бесман — 180 проц., Фунт — 160 проц., Гольдберг — 150 проц.

Стаханаўцы брыгады допельшчыкаў (брыгадзір тав. Варабейчык) тт. Ефімовіч, Адамовіч. Чыстая сістэматычна даюць 150—200 проц. нормы, выпускаючы высакаякасную прадукцыю.

На 170—180 проц. выконваюць нормы стаханаўцы брыгады зацяжчыкаў пашывачнага цэха тт. Валачынскі і Стурман.

Рабочыя фабрыкі актыўна павышаюць сваю тэхнічную пісьменнасць. 159 чалавек займаюцца ў гуртках па здачы тэхнічнага мінімума першай і другой ступені. 66 чалавек ужо здалі дзяржаўны тэхнічны экзамен.

ПА ПРЫКЛАДУ ПЕТРА КРЫВАНОСА

Трэцюю гадавіну стаханаўскага руху мы, крываносаўцы Гомельскага дэпо Беларускай чыгункі, сустракаем новымі перамогамі ў сваёй рабоце.

Я працую машыністам пасажырскіх паязлоў на ўчастку Менск—Бахмач. Ужо тры месяцы як наша паравозная брыгада ўключылася ў кальцавую язду без заходаў у дэпо Гомель. Гэтым мы скарачаем удвая прастой паравоза і абслугоўваем свой лакаматыў двума брыгадамі, замест трох брыгад, якія працавалі да кальцавой язды. У чэрвені, ліпені і жніўні мы эканомілі з памочнікам машыніста тав. Крэпастным па 10—15 тон апалу штомесяц.

Мы не ведаем эпазненняў у дарозе. Свой паравоз прывялі ў культурны і тэхнічна выдатны стан.

Наш паравоз № 9671 гатоў да работы ў зімовых умовах.

Дасягнутыя поспехі мы замацуем і ў далейшым.

Ф. І. КАВАЛЕЎ,
машыніст-крываносавец дэпо Гомель.

У ГОНАР ТРЭЦЯЙ ГАДАВІНЫ СТАХАНАЎСКАГА РУХУ

Калектыў рабочых, работніц, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых цагельнага завода № 31 (Віцебск) сустракае трэцюю гадавіну стаханаўскага руху новымі поспехамі. У рэзультаце разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва па вырабу будаўнічых матэрыялаў, калектыў рабочых прэса № 3, у ліку 34 асоб. стаў суцэльна стаханаўскім. Норму выпрацоўкі ён перавыконвае на 200 і больш процантаў.

Асабліва высокую выпрацоўку паказвае з'ёмшчыца прэса № 3 Казакова Анастасія Фёдараўна, якая дае 340—350 процантаў нормы, брыгада кар'ершчыка Конанава, гамоўшчыка Адамовіча і інш.

За сістэматычнае перавыкананне норм А. Ф. Казакова прэзідыумам БРК саюза цагельнай прамысловасці прэміравана пуцёўкай на курорт.

ДНЕПРА-ДЗВІНСКАЕ ПАРАХОДСТВА ВЫХОДЗІЦЬ У ПЕРАДАВЫЯ

Днепра-Дзвінскае параходства, якое ў мінулым сістэматычна не выконвала планы, за апошні час значна палепшыла работу. Вытворчы план ліпеня месяца (найбольшага мелкаводдзя) параходствам выканан па танажу на 105,8 проц. і па тона-кілометрах—на 103,2 проц.

З вялікім уздымам воднікі басейна сустрэлі загад свайго баявога наркома Нікалая Іванавіча Ежова аб выкананні ліпеньскага плана перавозак, у якім адзначана, што Днепра-Дзвінскае параходства выходзіць у перадавыя.

Работнікі прыстані Гомельскага порта і плывучых ўчасткаў прапрацоўваюць загад, выносяць свае абавязацельствы — замацаваць дасягнутыя поспехі і датэрмінова закончыць навігацыйны план бягучага года.

Некаторыя параходы набліжаюцца да выканання навігацыйных планаў. Пасажырскі параход «Совецкая Беларусь» ужо выканаў гадавы план на 93,1 проц.

Міх. ЛАУШУК.

НАПЯРЭДАДНІ ПРЫЗЫВА Ў ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ

АГУЛЬНАМАСКОЎСКІ СХОД ПРЫЗЫЎНІКАЎ

Выступленне тав. А. І. Угарава

Зялёны тэатр Цэнтральнага парка культуры і адпачынку імя Горкага 27 жніўня быў перапоўнен шчаслівай і жыццерадаснай моладдзю. Тут на агульнамаскоўскі гарадскі сход прызыўнікаў, скліканы МГК ВКП(б), Мосоветам і МГК ВЛКСМ, сабралася звыш 20 тысяч чалавек — равеснікаў Кастрычніка — палкіх патрыётаў краіны Советаў, якія ідуць у гэтым годзе ў рады слаўнай і доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Па прапанове прызыўніка - слесара аўтазавода імя Сталіна тав. Осіпава ўдзельнікі схода пад бурныя апладысменты выбіраюць у ганаровы прэзідыум таварыша Сталіна, кіраўнікоў партыі і ўрада.

З дакладам выступіў намеснік народнага камісара абароны армейскі камісар 2-га ранга тав. Шчадзенка. Бурнымі апладысментамі і крыкамі «ура» сустрэлі прызыўнікі словы тав. Шчадзенка, у якіх ён перадаў прывітанне ад правадыра Чырвонай Арміі маршала Совецкага Саюза народнага камісара абароны таварыша Варашылава.

На трыбуне — прызыўнік - слесар завода «Калібр» тав. Зотаў. Ад імя прызыўнікаў сталіцы ён перадаў прывітанне партыі і ўраду і асабіста таварышу Сталіну.

— Я прызыўнік 1918 года, — гаворыць ён, — мой бацька аддаў сваё жыццё ў часе грамадзянскай вайны за шчасце народа.

Я скончыў школу-сямігодку і ў 1936 годзе школу ФЗВ пры заводзе «Калібр». Зараз я стаханавец — вытворчыя нормы выконваю на 250—300 проц. У 1935 годзе уступіў у рады Ленінска-Сталінскага комсамола. У 1936 годзе комсамол пасылае мяне вучыцца ў Цэнтральны аэраклуб імя Косарэва. У 1937 годзе скончыў лётную школу і зараз маю званне пілота. Я здаў усе нормы на значкі ГПА, ПІХА, ГСА і варашылаўскага стралка. У гэтым годзе я прынят кандыдатам у члены комуністычнай партыі большэвікоў. З вялікай радасцю я ўступаю ў рады байцоў РСЧА. Я клянуся чэсна служыць у радах нашай Чырвонай Арміі, быць дастойным грамадзянінам Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік. З гонарам стану на абарону нашых граніц і, калі трэба будзе, я не пашкадую аддаць сваё жыццё за нашу радзіму, за партыю і роднага бацьку—вялікага Сталіна.

У канцы схода выступіў сакратар МК і МГК ВКП(б) тав. А. І. Угараў.

З вялікім уздымам удзельнікі схода паслалі прывітанні таварышам Сталіну, Молатаву і Варашылаву.

(БЕЛТА).

ВЫТВОРЧЫЯ ПАДАРУНКІ БУДУЧЫХ БАЙЦОЎ

СМАЛЯВІЧЫ. Праз некалькі дзён маладыя патрыёты — равеснікі Кастрычніка — прыдуць на прызыўныя пункты. У сувязі з прызывам на прадпрыемствах, установах значна ўзмацнілася абаронная работа. Прызыўнікі праходзяць завяршаючы этап абучэння ў абаронных гуртках.

Мощнае, развітае палаўненне атрымае ў гэтым годзе Чырвоная Армія. Сярод прызыўнікаў 177 чалавек здалі нормы на значок ГПА, 190—на значок ПІХА, 146 — варашылаўскія стралкі. Усе прызыўнікі пісьменныя. Многія маюць сярэднюю і вышэйшую асвету.

У гонар прызыва дапрызыўнікі паказваюць стаханаўскія ўзоры працы. Прызыўнік 1917 года — трактарыст Сіманчык Сцяпан закончыў гадавы план ворыва. Да дня прызыва ён абавязаўся галаўны план выканаць на 150 проц.

Такіх, як тав. Сіманчык, у раёне дзесяткі. Кожны гарыць жаданнем хутчэй пайсці ў Чырвоную Армію.

К. ПРЫМІЧОЎ.

БУДЗЕМ ДАПАМАГАЦЬ ШКОЛЕ Ў ВЫХАВАННІ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ

(Адкрытае пісьмо бацькоў вучняў 7-б класа 45-й школы г. Менска)

Наступае новы вучэбны год. Гэты вучэбны год павінен прайсці больш паспяхова, чым усе мінулыя. Мы, бацькі вучняў 7-б класа 45-й школы, звяртаемся з заклікам уключыцца ў спаборніцтва за паспяховае правядзенне вучэбнага года ў кожнага вучня нашага любімага правадыра—таварыша Сталіна.

Выхоўваць у рэбят культурныя і беражныя адносіны да сацыялістычнай маёмасці.

Старанна наглядаць за тым, каб рэбяты культурна абыходзіліся з таварышамі і старэйшымі ў школе, на даму, у грамадскіх месцах, на вуліцы.

Будзем сістэматычна наведваць школу. У мэтах узаемнай дапамогі настаўнікам, будзем узгадняць і кантраляваць сумесна з класным кіраўніком пазашкольнае чытанне рэбят, наведванне тэатра і кіно. Забяспечым рэбят піонерскімі газетамі.

Выклікаючы на соцспаборніцтва бацькоў паралельнага 7-а класа 45-й школы, заклікаем усіх бацькоў вучняў уключыцца ў гэта соцспаборніцтва і нараўне са школай адказваць за палітычнае выхаванне сваіх дзяцей.

Просім настаўнікаў і бацькоў паставіць пытанне аб арганізацыі соцспаборніцтва на школьных бацькоўскіх сходах, арганізаваўшы справу так, каб настаўнікі і бацькі збіраліся не раз у год, а сістэматычна, па раду цікавых і хвалюючых пытаннях вучобы і выхавання нашых дзяцей.

Па даручэнню схода бацькоў 7-б класа 45-й сярэдняй школы г. Менска:

ШЧУГАРАЎ ЛЕНКЕВІЧ, БАНДАРЭНКА, ШЫФРЫНА С., БУШМАН, ГЛУХОЎСКІ, РАМАНАЎ і інш.

з совецкай зямлі, нам трэба было абыходзіць краі возера, гэта значыць рухацца ўздоўж самой граніцы, нападаючы пад жорсткі агонь японскіх войск якія знаходзіліся не толькі на вышынях Заазёрная і Безымянная, але і на іншых узвышшах, якія цягнуцца направа і налева ўздоўж граніцы.

Мы былі запіснуты на вузкім прасторы паміж возерам і граніцай Вялома, мы маглі-б значна хутчэй расправіцца з зарваўшымся ворагам, калі-б парушылі граніцу і авалодалі сопкамі, абыходзячы іх па манчжурскай тэрыторыі. Але нашы часці точна выконвалі загад камандавання і дзейнічалі ў межах сваёй тэрыторыі. У наступныя дні мы ўбачылі, наколькі гэта было цяжкім.

Наш батальён наступаў на японцаў праз паўднёвы подступ, маючы задачай заняць Заазёрную. Перад намі ляжаў прастор у паўтараста метраў, скрозь аплецены дротам і знаходзячыйся пад перакрыжаваным кулямётным агнём. Праз гэты лабірынт агню і дроту нам прадстаяла прабіцца і выкінуць захватчыкаў з совецкай зямлі. У такім-жа становішчы знаходзіліся нашы часці, наступаўшыя праз паўночны подступ на Безымянную.

Усю ноч і ў наступныя дні мы адбівалі не спыняючыяся контратакі японцаў штыкавымі ўдарамі адкідвалі ворага назад, на яго пазіцыі. Мы рухаліся наперад, б'ючыся літаральна за кожны крок: ні жорсткія контратакі японцаў, ні агонь кулямётаў, які не спыняўся ні на хвіліну не маглі спыніць нашых байцоў Павольна, але няўхільна мы набліжаліся да японскіх загародаў.

Байцы далёкаўсходнікі, палкія патрыёты не лічачыся ні з якімі труднасцямі, імкнуліся хутчэй выканаць пастаўленую камандаваннем задачу. Адна з рот папрасіла ў камандавання дазволу пранікнуць праз загароды і атакаваць японцаў Добраахвотнікі, канкурыруючы адзін перад адным, настойліва дабіваліся задаволення іх просьбы Камандаванне дазволіла.

Пад прыкрыццём туману смельчакі расканцэнтраваліся на паўтараста метрах ляжачага наперадзе прастору і, перамагаючы дрот, падпаўзлі да японскіх умацаванняў Калі туман рассеяўся, яны былі заўважаны японцамі але паспелі за гэты час акапацца настолькі, што, як ні стараліся іх японцы выбіць, нічога не выходзіла.

За гэтыя дні наша камандаванне закончыла сканцэнтраванне тэхнічных сродкаў у колькасці, неабходнай для рашучага ўдару па захватчыках.

4 і 5 жніўня ішлі бесперапынныя дажджы Дарогі размоклі, балоты ператварыліся ў азёры, што яшчэ больш ускладняла наша манеўраванне.

6 жніўня — дзень гадавіны Далёкаўсходняга Чырвонасцяжнага Фронта З раніцы, як заўсёды, было гуманна. Каля поўдня туман праяснёўся. Раптам загудзела неба. Гэта ішлі нашы самалёты Вось адзін дзесятак, другі, трэці, чацвёрты... іх было шмат У баявым страі яны ішлі на працёўніка.

Падняліся ўверх слупы зямлі на бязлесных грэбнях занятых японцамі сопак, узляцелі абломкі японскіх гармат, шчэпкі зруйнаваных японскіх умацаванняў.

Як-бы спрачаючыся ў магутнасці з разрывамі авіябомб, загрукатала наша артылерыя. Яе снарады клаліся ў палосе японскіх пазіцый Магутная артылерыйская падрыхтоўка злілася ў адно з авіябамбардыроўкай Як відаць не салодка адчувалі сябе японцы, атрымліваючы нашы гасцінцы!

Услед за бамбардыроўшчыкамі ўключыліся ў бой знішчальнікі Кулямётным агнём яны паліваюць японскую пяхоту.

Прышла чарга для дзеянняў нашай пяхоты. У суправаджэнні танкаў яна рынулася ў атаку праз вузкі прастор. Японская артылерыя б'е па танках прамой наводкай. Танкі ныраючы ў няроўнасцях мясцовасці, аспярожна выбіраюць вузкія палоскі праходзімага прастору, давяць дрот і ўрэзваюцца ў размяшчанне японскіх пазіцый Байцы разрываюць дрот нажніцамі, падрываюць яго ручнымі гранатамі. Нашы выдатныя байцы пагарджаючы агнём японскай артылерыі, устаноўленай на манчжурскай тэрыторыі, упэўнена рухаюцца наперад; падраздзяленні спаборнічаюць адно з адным у тым, каб першымі ўвайсці з чырвонымі сцягамі на родную совецкую Заазёрную сопку

К вечару самалёты паўтарылі атаку Зноў гром разрываў, слупы зямлі. Артылерыйскі агонь японцаў паслаб, відаць некалькі японскіх батарэй былі падбіты нашай авіяцыяй і нашай артылерыяй.

Я не ўдзельнік імперыялістычнай вайны, але ведаю па апісаннях, якой сілы дасягаў агонь на фронце ў перыяд найбольш напружаных баёў 6 жніўня і ў наступныя дні мы прарабілі тое, што рабілася ў тыя часы пры атацы вельмі ўмацаваных пазіцый і што ўвайшло ў гісторыю як прыклады небывалага ўпорства і абароны і наступлення.

Спусцілася ноч. Бой не спыняўся, але японцы пачалі здаваць. Яшчэ націск яшчэ раз брасок у атаку. З крыкамі: «Ура! Няхай жыве вялікі Сталін!» байцы імкнуцца ўверх па крутых схілах сопкі Вораг не вытрымаў,—сопка наша! Заазёрная (Чанкуфын) зноў у нашых руках.

Досвіткам на Заазёрнай развяваліся чырвоныя сцягі.

Японцы паспелі грунтоўна ўмацавацца на вышыні. Яны пакінулі акопы глыбінёй ў поўны профіль, убежышчы і бліндажы для пяхоты, грунтоўна разбураныя дзеяннямі нашай авіяцыі і артылерыі. Дротавыя загарожы перад японскімі пазіцыямі былі пабудаваны ў 3—4 рады колляў, упередзе іх былі адкапаны процітанкавыя рвы. У пакінутых самураямі акопах мы знайшлі некалькі сот парожных бутэлек з-пад спіртнога розных марак.

Японцы не хацелі памірыцца з стратай вышыні. Азвярэлыя, з крыкамі «банзай» яны карабкаліся па каменнях на сопку Нашы байцы падпускалі іх на блізкую адлегласць, а затым закідвалі ручнымі гранатамі Так адбіваліся неаднаразовыя контратакі японцаў. Большасць наступаўшых аставалася на месцы забітымі, а ўцалеўшыя скатваліся назад уніз.

У далейшыя дні асноўныя баі разгарнуліся на вышыні Безымянная дзе японцы яшчэ займалі частку нашай тэрыторыі Стараючыся выбіць японцаў, нашы часці мімаволі ўклініліся метраў на 300—400 у японскае размяшчэнне па той бок граніцы.

Японская артылерыя прадаўжала весці агонь, стараючыся падбіць нашы гарматы. Аднак агонь японцаў страдаў адным «дэфектам», снарады трапляілі куды ўгодна, толькі не ў цэль. Наша артылерыя ўпэўнена выконвала свае задачы, паражаючы непрыяцельскія гарматы 8 жніўня па нашаму батальёну адкрыла ўзмоцнены агонь адна з японскіх батарэй, перашкаджаючы нашаму наступленню. Пасля таго, як наша артылерыя накіравала агонь па гэтай батарэі, мы на сябе адчулі паспяховыя рэзультаты ў рабоце нашых артылерыстаў: спачатку японскі агонь аслаб, а затым спыніўся.

Баі за Безымянную багаты эпізодамі гераічных паводзін байцоў-патрыётаў. 9 жніўня група смельчакоў-добраахвотнікаў папрасіла ў камандавання дазволу знішчыць дзве японскія ўмацаваныя кропкі, якія ў асаблівасці перашкаджалі нашым дзеянням. Ноччу смельчакі падпаўзлі да ўмацаваных кропак, заклалі фугас і ўзарвалі адну з іх Другую кропку яны прымусілі замаўчаць, ведучы бесперапынны агонь па амбразуры, адкуль да гэтага страляў японскі кулямёт.

Адно з нашых аддзяленняў, скрыта падышоўшы да размяшчэння праціўніка, сваім умелым агнём знішчыла японскі ўзвод.

На паўднёвым участку ў той-жа дзень, 9 жніўня, калі каля двух рот пяхоты праціўніка, пераправіўшыся праз р. Тумень-Ула, збіраліся нас атакаваць, яны былі знішчаны: адна рота на месцы нашым артылерыйскім агнём, а другая—пры адступленні ўплаў праз раку Выдатна дзейнічалі нашы сапёры, якія пад агнём японцаў будавалі ўмацаванні на адбітых намі вышынях.

Вялікімі намаганнямі перамагаючы труднасці мясцовасці і японскай абароны, нашы байцы камандзіры і палітработнікі паслядоўна выконвалі волю совецкага народа, выказаную правадыром народаў таварышам Сталіным: «Ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддадзім нікому»

Мы не хочам ні карэйскай, ні манчжурскай зямлі, але раім вам, паны японцы пакінуць надзеі на валоданне нашымі сопкамі, азёрамі, пахацямі, гарадамі Калі не хочаце зыйціся на гэтым падобраму, мы вас пераканаем сілай, колькі-б войск вы ні сабралі і якіх-бы там гэта намаганняў ні каштавала Такімі настроямі былі прасякнуты ўсе, хто ў тыя дні драўся з захватчыкамі. Вялікая сіла любві да радзімы, гарачае пачуццё совецкага патрыятызма кіравалі нашымі дзеяннямі ў гэтыя незабыўныя дні. З імем вялікага Сталіна на вуснах, пад чырвонымі сцягамі краіны сацыялізма мы ішлі ў бой і перамагалі. Гатоўнасць усёй неасяжнай совецкай краіны адбіць налётчыкаў натхняла нас у цяжкіх умовах баявой работы.

Беспартыйныя чырвонаармейцы і камандзіры ў перыяд баёў масамі падавалі заявы аб прыняцці іх у партыю і комсамол. «Хочам ісці ў бой членамі партыі Леніна — Сталіна, членамі Ленінскага комсамола», — заяўлялі яны. У баі яны сваім беззаветным геройствам даказалі адданасць справе партыі і шчырасць свайго імкнення быць у яе радах. Зараз яны ўліліся ў нашу партыйную і комсамольскую сям'ю Партыйныя і беспартыйныя большэвікі, змагаючыся плячом к плячу, перамаглі труднасці і вышвырнулі абнаглеўшых самураяў з роднай зямлі.

Да моманту перамір'я, якое было абвешчана 11 жніўня на совецкай тэрыторыі не было больш ні аднаго японскага салдата. Японцы паспрабавалі было ў самы апошні момант высунуцца наперад на нашу тэрыторыю, накапляючыся за каменнямі сопкі Заазёрная. Яны скарысталі тое, што агонь з нашага боку быў спынен у сувязі з пачаўшымся перамір'ем. Аднак настойлівая пазіцыя нашага камандавання прымусіла японцаў паважаць заключанае пагадненне і адыйсці на лінію, якую яны займалі да перамір'я.

Зараз мы ўпэўнена трымаем у сваіх руках адваяваныя сопкі палітыя крывёю сыноў сацыялістычнай радзімы, паўшых на абароне совецкіх граніц.

«ПРАВДА».

СЕЛЬСКІ ДОМ КУЛЬТУРЫ

Звычайны будні жнівеньскі вечар. Бледны месяц ярка свеціць на зорным небе. Ціхі ветрык ледзь калыша галінкі ліп. Па-святочнаму ажыўлен Цярпынскі дом соцкультуры і ваколічны яго парк. Моладзь калгаса сабралася сюды пагуляць, адпачыць пасля дзённай працы.

У парку на танцавальнай пляцоўцы іграе гармонік. Загарэлыя пары юнакоў і дзяўчат лёгка кружацца ў павольным вальсе. Астатнія гуляюць па алеях парка. Тут завязваюцца знаёмствы. Тут шчаслівая моладзь расказвае таварышам аб поспехах сваёй работы, дзеліцца ўражаннямі аб вялікіх перспектывах будучага...

Вось група юнакоў цесным кругам абступіла патэфон. Вялікі выбар новых пласцінак. У сугучнасці з патэфонам звіняць дзявочыя галасы.

«... Если завтра война,
Если завтра в поход,
Будь сегодня к походу готов!»

Добра скарыстан будынак былой цярпынскай царквы. Ён поўнасцю перабасталёван не толькі ўнутры, але і знадворку. З носьбіта цемры і невуцтва ён ператворан у сродак культурнай работы і адпачынку.

Вялікая зала ўпрыгожана партрэтамі правадыроў партыі і ўрада. Лозунгі і плакаты заклікаюць на барацьбу за ўмацаванне калгасаў, якаснае правядзенне ўборкі, на гатоўнасць абараняць нашу радзіму. Пры зале ёсць пакой для ігры ў шахматы, шашкі, даміно і чыткі газет. Абсталёўваецца асобны пакой для бібліятэкі. Дарэчы, работа бібліятэкі ніяк не задавальняе чытачоў. Вось чаму зараз прыняты меры для расшырэння кніжнага фонда. Вызначана 6 тыс. рублёў на набыццё новых кніг.

Загадчык дома соцкультуры комсамолец тав. Лукашэвіч, сам заўсёды жвавы і вясёлы, прыкладна паставіў працу ДСК, арганізаваў вакол сябе комсамольцаў і несаюзную моладзь для разгортвання культурнай работы.

Уся работа плануецца. Тут—вечары самадзейнасці, даклады, лекцыі, пастаноўкі, кінокарціны. Добра працуе драмгурток. У ім налічваецца 19 чалавек. Калгаснікі і вясковая інтэлігенцыя В. Церашкоў, П. Ермакова, В. Савіцкі, М. Кунцоў, Г. Рогаў і іншыя—актыўна ўдзельнічаюць у драмгуртку і ў іншай рабоце клуба. За апошні час на сцэне дома соцкультуры і ў навукольных калгасах пастаўлены п'есы «Любоў яравая», «Маску далоў», «Прымакі», «Цудоўная сустрэча». Дэкарацыю, касцюмы, парыкі драмгурток атрымаў ад Усесаюзнага дома народнай творчасці.

За 4 месяцы прачытана 8 лекцый і дакладаў, пастаўлена 7 пастановак. Для правядзення лекцый і дакладаў запрашаюцца настаўнікі, работнікі МТС, урачы. Настаўнік тав. Векшын зрабіў некалькі лекцый на антырэлігійныя тэмы. Парторг МТС тав. Хруцкі робіць даклады і праводзіць гутаркі па пытанню міжнароднай палітыкі. У жнівеньскі план уключана лекцыя ўрача, агранома, акушэркі і даклад аб падзеях на Далёкім Усходзе.

Асабліва вялікая работа праведзена домам соцкультуры ў час кампаніі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР. Была створана комсамольская агітбрыгада, якая зрабіла чатыры выезды ў калгасы Комсеніцкага і Сіманаўскага сельсоветаў. Брыгада праводзіла даклады аб Сталінскай Канстытуцыі, растлумачвала «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет». Ставіліся пастаноўкі і арганізоўваліся выступленні групы зацейнікаў. Агітацыйная работа цяпер яшчэ больш узмацняецца. Набыты вопыт замацоўваецца.

Пры доме соцкультуры праводзяцца нарады загадчыкаў калгасных клубаў і калгасных гурткоў. Лепшы вопыт работы аднаго клуба робіцца здабыткам усіх.

Цярпынскі дом соцкультуры можа і павінен яшчэ шырэй разгарнуць культурна-масавую работу сярод калгаснікаў. Патрэбна толькі штодзённае кіраўніцтва і дапамога дому соцкультуры з боку партыйнай арганізацыі і сельсавета, якія да гэтага часу зусім мала займаліся такім важным участкам работы.

Д. ПУЛЬЯНАЎ.
Круглянскі раён.

Прызыўнікі-стаханаўцы Менскага завода ланцугоў Галя. НА ЗДЫМКУ (злева направа): С. Л. ЛІБО — слесар, брыгадзір, А. Е. СКАРОМНЫ — абточчык ланцугоў, выконвае свае нормы на 350 проц., і Н. І. ВЕЛІКЖАНІН — шліфавальшчык, выконвае свае нормы на 500 проц.
Фото Л. Мазелева (СФ).

НА КАНФЕРЭНЦЫІ НАСТАЎНІКАЎ г. МЕНСКА

Два дні—26 і 27 жніўня—настаўнікі Менска ўдзельнічалі ў работах секцый, дзе абмяркоўваліся новыя праграмы, метадычная работа ў школе, асобныя метадычныя распрацоўкі, узорныя планы і інш.

Учора, 28 жніўня, адбылося заключнае пасяджэнне канферэнцыі, на якім абмяркоўвалася пытанне аб палітычнай адукацыі настаўнікаў.

Выступіўшыя ў спрэчках настаўнікі адзначылі, што совецкі настаўнік толькі тады зможа паспяхова ажыццяўляць ганаровы абавязак—комуністычнае выхаванне шчаслівай совецкай дзетвары, калі сам будзе ўсебакова, палітычна адукаван. Для таго, каб узняць палітычную адукацыю настаўнікаў, неабходна неадкладна стварыць сетку гурткоў па вывучэнню гісторыі партыі, ленінізма, гістарычнага і дыялектычнага матэрыялізма.

У рэзалюцыі па дакладу аб выніках 1937-38 вучэбнага года канферэнцыя адзначыла дрэнную работу гарана па кіраўніцтву школамі, недапушчальнасць другагодніцтва, неабходнасць паляпшэння ідэйна-палітычнага выхавання вучняў, недастатковую работу піонерскіх і комсамольскіх арганізацый школ і інш.

Канферэнцыя абмеркавала і прыняла дагавор па соцспаборніцтву паміж школамі Менска і Гомеля.

Пад доўга не змаўкаемыя апладысменты настаўніцтва Менска паслала прывітальную тэлеграму вялікаму правадыру народаў—лепшаму другу совецкіх настаўнікаў таварышу Сталіну.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

НА ПЕРШЫ КУРС І АДНАГАДОВАЕ ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ВЫШЭЙШАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ШКОЛЫ БЕЛАРУСІ ІМЯ ЛЕНІНА НА 1939 ВУЧЭБНЫ ГОД

1. Вышэйшая комуністычная сельскагаспадарчая школа Беларусі імя Леніна ставіць сваёй задачай падрыхтоўку для раённых партыйных і совецкіх арганізацый, а таксама для соўгасаў, МТС, МТМ і калгасаў кваліфікаваных кіруючых работнікаў — арганізатараў буйнай соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, якія авалодалі-б, побач з шырокім палітычным развіццём, дастатковымі спецыяльнымі ведамі як у галіне сельскагаспадарчай тэхнікі, так і ў галіне агранаміі, жывёлагадоўлі і арганізацыі калгасаў і соўгасаў.

2. На асноўны курс ВКСГШБ прымаюцца члены і кандыдаты ВКП(б), спачуваючыя ВКП(б), комсамольцы і непартыйныя большэвікі, маючыя стаж кіруючай работы ў раённых партыйных і совецкіх арганізацыях, соўгасах, МТС, старшыні сельсоветаў і калгасаў, загадчыкі фермамі, брыгадзіры, ордэнаносцы і лепшыя стаханаўцы сельскагаспадарчай вытворчасці, якія маюць агульнаадукацыйную падрыхтоўку ў аб'ёме 7 груп і партыйна-палітычную — у аб'ёме палітгуртка павышанага тыпу. На аднагадовае падрыхтоўчае аддзяленне прымаюцца таварышы, якія маюць агульнаадукацыйную падрыхтоўку ў аб'ёме 5—6 груп і партыйна-палітычную — у аб'ёме палітгуртка палітграматы.

3. Адбор кандыдатур для паступлення ў ВКСГШБ праводзіцца гаркомамі, райкомамі і абкомамі партыі. Усе жадаючыя паступіць на вучобу ў ВКСГШБ падаюць заявы ў ГК і РК КП(б)Б, якія па разгляду пытання бюро РК КП(б)Б усе матэрыялы рэкамендуемых прадстаўляюць на зацвярджэнне абкома КП(б)Б.

4. На ўсіх адабраных і зацверджаных абкомамі КП(б)Б таварышаў прадстаўляюцца ў мандатную камісію ЦК КП(б)Б наступныя дакументы:

а) заява аб паступленні на вучобу ў ВКСГШБ з указаннем, на якое аддзяленне;

б) камандыроўка абкома партыі (рашэнне абкома);

в) палітычная і дзелавая характарыстыка за подпісам сакратара райкома партыі;

г) завераная райкомам партыі аўтабіяграфія;

д) запоўненая анкета з двума фотакарткамі, завераная райкомам партыі;

е) копія воінскага білета, завераная райваенкаматам;

ж) спраўка ўрача аб стане здароўя.

УВАГА: Хворыя заразнымі хваробамі, неўрастэнікі, хварэючыя малакроўем, страўнікавымі хваробамі і з агульным слабым станам здароўя ў ВКСГШБ не прымаюцца. Інваліднасць, якая не адбіваецца на разумовай працы, не з'яўляецца перашкодай для паступлення ў ВКСГШБ.

5. Камандна-палітычны і радавы састаў РСЧА прымаецца ў ВКСГШБ па рэкамендацыях і камандыроўках начальнікаў палітаддзелаў дывізій.

6. Камандыруемым на вучобу ў ВКСГШБ прадастаўляецца паўтарамесячны водпуск для падрыхтоўкі з захаваннем зарплаты па месцу работы (пастанова НКП СССР ад 8 мая 1929 года).

7. Студэнты ВКСГШБ забяспечваюцца стыпендыяй у размеры 261 руб. у месяц і падручнікамі. Для студэнтаў арганізуецца бясплатнае медабслугоўванне. Харчаванне і інтэрнат прадастаўляюцца за ўстаноўленую плату.

ВКСГШБ жыллёвай плошчы для сем'яў студэнтаў не прадастаўляе. Сям'я павінна быць забяспечана жылплошчай па месцу ранейшай работы паступіўшага на ўвесь перыяд яго вучобы пад адказнасць камандыруючых арганізацый.

8. Камандыруючыя арганізацыі павінны:

а) выдаць камандыруемым на-рукі адмацавальныя талоны аб знятці з учоту ў партыйных і комсамольскіх арганізацыях (для членаў і кандыдатаў партыі і комсамольцаў);

б) аплаціць камандыруемым праезд і выдаць сутачныя;

в) захаваць за камандыруемымі іх ранейшае месца работы да канчатковага іх залічэння ў ВКСГШБ.

9. Мандатная камісія па прыёму ў ВКСГШБ змяшчаецца па вул. імя Карла Маркса, дом № 34-а, вучэбны корпус ВКСГШБ, тэлефон 21-790.

Набор пачынаецца з 30 жніўня і заканчваецца 1 снежня 1938 года.

Пачатак заняткаў 1 студзеня 1939 г.

Заг. сельгасаддзелам ЦК КП(б)Б. КАЛІНІН.
Рэктар ВКСГШБ ЮРАЎ.

МІЖНАРОДНЫ РЭКОРД т. КАРТАШЭВА ЗАЦВЕРДЖАН ФАІ

Цэнтральным аэраклубам СССР імя А. В. Косарэва атрымана з ФАІ (Міжнародная Авіяцыйная Федэрацыя) паведамленне аб тым, што палёт пілота-парыцеля І. Карташэва з пасажырам П. Саўцовым на планеры «Стаханавец», зроблены 17 ліпеня гэтага года, прызнан міжнародным рэкордам дальнасці палёту па прамой лініі, клас «Д» другой катэгорыі (многамесныя планеры).

Як вядома, тав. Карташэў праляцеў без пасадкі адлегласць 619 кілометраў 748 метраў. Стартаваўшы ў Маскве, ён зрабіў пасадку ў сяле Ушня, Чэрнігаўскай вобласці.

—о—

ПА ГАРАДАХ І РАЁНАХ РЭСПУБЛІКІ

⊙ Цяжка хвораму калгаснику сельгасарцелі «Чырвоная Беларусь», Піркаўскага сельсавета, Камарынскага раёна, тав. М. С. Еўтушэнка, патрэбавалася неадкладная хірургічная дапамога. На месцы аказаць гэтую дапамогу не прадстаўлялася магчымым. Тады раённы аддзел аховы здароўя звярнуўся за дапамогай у Менск. Хутка быў снаражон самалёт санітарнай авіяцыі. Тав. Еўтушэнка на самалёце даставілі ў Мазыр, дзе яму была зроблена тэрміновая аперацыя. Жыццё калгасніка было выратавана.

⊙ У калгасах Чавускага раёна ў 1937 годзе было ўсяго 17 аўтамабіляў. Толькі за першую палову 1938 года калгасы набылі 19 новых аўтамашын. Калгас «Юны комунар», Благаўскага сельсавета, мае цяпер 2 аўтамашыны.

ТРЭЦІ ТЫРАЖ ПАЗЫКІ ЎМАЦАВАННЯ АБАРОНЫ СССР

11 верасня 1938 г. у г. Одэсе адбудзецца трэці тыраж выйгрышаў пазыкі Умацавання абароны СССР.

У тыражы будзе разыграна 265 тысяч выйгрышаў на суму 43 мільёны 703 тысячы 800 рублёў.

СТРАЛКОВАЯ СПАРТАКІЯДА НАРОДАЎ СССР. НА ЗДЫМКУ (злева направа): удзельнікі спартакіяды Тамара Бачкурынская (Малдаўская АССР), якая выбіла 350 ачкоў з 400 магчымых, і Валя Нагаенка (Паўночна-Осецінская АССР), выбіўшая 186 ачкоў з 200 магчымых.
Фото Б. Федасеева (СФ).

ГРУЗАВЫЯ ЗНОСІНЫ ПА АЎТАМАГІСТРАЛІ МЕНСК—МАСКВА

У сувязі з набліжэннем сканчэння будаўніцтва аўтамагістралі Менск—Масква Соўнарком БССР намеціў рад мерапрыемстваў па арганізацыі грузавых зносін па гэтай магістралі.

Ухвалена прапанова Заходняй чыгункі аб стварэнні ў Віцебску, Оршы і Барысаве транспартна-экспедыцыйных кантор па грузавых аўтаперавозках. Начальніку Беларускай чыгункі прапанавана распрацаваць да 1 кастрычніка пытанне аб развіцці аўтамабільна-грузавых зносін па аўтамагістралі ў раёне Беларускай чыгункі—Менск — Магілеў, Магілеў — Гомель і інш.

Гарадскімі советамі Менска, Барысава і Оршы павінна быць прадугледжана ў плане 1939 года рэканструкцыя дарожных пакрыццяў на падходах да аўтамагістралі Менска — Масква ў межах гарадской чарты і ўездаў на асноўныя складскія базы. Такія-ж работы павінны быць праведзены ў Магілеве, Віцебску і Гомелі.

Намечаны таксама мерапрыемствы па абслугоўванню глыбінных пунктаў, звязаных з аўтамагістраллю.

СПРАВА ГРУПЫ БЫЛЫХ РАБОТНІКАЎ БЕЛБУДПРАМТРЭСТА

Упраўленнем міліцыі НКВД БССР закончана следства па справе групы былых работнікаў Белбудпрамтрэста, якія абвінавачваюцца ў раскрадванні дзяржаўных сродкаў. Шляхам падлогаў і падробак грашовых і бухгалтарскіх дакументаў і іншымі камбінацыямі ўдзельнікамі групы раскрадзена 316 тыс. рублёў.

Па справе прыцягнуты 22 чалавекі. Адзін з галоўных абвінавачваемых—б. начальнік будаўніцтва Вялікага тэатра ў Менску Куфман — раскраў 153 тыс. рублёў. Ён меў у Дзяржбанку скрыты рахунак, на які пераводзіліся раскрадваемыя грошы, а затым прысвайваліся. Галоўбух трэста Стаўровіч выпісваў разліковыя лісткі на быццам-бы зробленыя земляныя работы. Такім чынам групай было прысвоена 70.000 рублёў і т. д.

У ліку галоўных абвінавачваемых—касір Гулякевіч, тэхнікі Ермоліцкі, Кацанэльбоген і інш., якія прыцягваюцца да адказнасці па закону ад 7 жніўня 1932 г.

8 НОВЫХ РЭКОРДАЎ

З 24 па 27 жніўня ў сталіцы БССР праходзілі ўсебеларускія матацыклетныя спаборніцтвы. На спаборніцтвах устаноўлена 8 новых усебеларускіх рэкордаў.

Па два рэкорды на дыстанцыю ў 1 кілометр з ходу і з месца ўстанавілі гоншчыкі: Еўстушоў (Менск)—на машыне «МПЗ» і хатняя гаспадыня т. Гантман (Менск)—на машыне «ІЖ-8».

Цікава прайшлі гонкі на 100 кілометраў. Пяршынства заваяваў гоншчык т. Скурчынскі (Менск). На матацыкле «Красный Октябрь» ён прайшоў гэту дыстанцыю за 1 гадзіну 19 мінут 30,2 секунды, устанавіўшы гэтым новы ўсебеларускі рэкорд.

Камандное пяршынства і пераходны прыз Цэнтральнага аўтамотаклуба БССР заваявала зборная каманда Менска. Другое месца заняла каманда Магілева.

УЗНАГАРОДА УДЗЕЛЬНІКАЎ ВЕЛАПРАБЕГУ БІГОСАВА-МАСКВА

У Дрысу вярнуліся з Масквы ўдзельнікі велапрабегу па маршруту Бігосава—Масква.

Адлегласць з Бігосава да Масквы было пройдзена за 8 дзён. Веласіпедысты ўзнагароджаны імяннымі жэтонамі. («В. Р.»).

Адзін з лепшых старэйшых джыгітаў калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (Цхакайскі раён, Грузінскай ССР) Іларыён Антанідзе.
Фото Э. Еўзерыхіна (СФ).

1.274 ПРОЦАНТЫ НОРМЫ

Стаханаўцы Віцебска, рыхтуючыся да трэцяй гадавіны стаханаўскага руху, паказваюць выдатныя ўзоры прадукцыйнасці працы.

25 жніўня электразваршчык паравознага дэпо тав. Пахолкін дабіўся рэкорднага паказчыка, — ён выканаў норму на 1.274 проц. У гэты-ж дзень токар вагонарамонтнага пункта тав. Макараў выканаў норму на 744 проц., каваль тав. Землякоў—на 731 проц.

На акулярнай фабрыцы лік стаханаўцаў павялічыўся з 246 да 321. Брыгада па выпрацоўцы цэлулоідных апраў сістэматычна выконвае план на 115 проц. Стаханаўкі тт. Фаміна і Рэйн выпрацоўваюць па 580 шафёрскіх акуляраў пры норме 400.

ЗАТРЫМАННЕ СПЕКУЛЯНТАЎ

За апошнія 7 дзён органамі Менскай міліцыі затрымана 50 спекулянтаў. У іх із'ята 1.130 метраў мануфактуры, 310 камплектаў гатовага адзення, 96 пар абутку, 117 штук трыкатажных вырабаў, 30 пар галош і іншыя тавары.

Сярод арыштаваных — буйная спекулянтка Садохава, якая прыехала ў Менск з Орлоўскай вобласці. У яе із'ята 15 пар галош, 25 камплектаў гатовага адзення, 28 метраў мануфактуры. Пры затрыманні ў міліцыі спекулянтка прабавала выкінуць тавар праз акно і прапанавала хабар міліцэйскаму работніку, каб ён яе вызваліў.

Вык. абавязкі адказнага рэдактара Д. Т. ЛЕБЕДЗЕЎ.

ГАСТРОЛІ ВІЦЕБСКАГА БЕЛДЗЯРЖТЭАТРА (Памяшк. Белдзярждрамтэатра)
29, 30 і 31 жніўня
К. ТРЭНЕЎ
ЛЮБОЎ ЯРАВАЯ
П'еса ў 4 актах, 6 карцінах.
Пачатак а 8 г. 30 м. веч.
Каса адкрыта а 11.30 да 2 г. дня і а 5.30 да 9 г. веч.

ДЗЯРЖЦЫРК (Парк імя Горкага)
СЕННЯ
музыкальна-эксцэнтрычная трупа хіліпутаў
КІНО-ДЖАЗ
і вялікая цыркавая праграма ў 8-х адд.
Пачатак у 9 г.
30 жніўня—раніцнік з удзелам ДЖАЗА ЛІЛІПУТАЎ. Пачатак у 2 г. дня. Каса—з 10 г. ран.

Кінатэатр «Чырвоная зорка» ПЕСНЯ МАЛАДОСЦІ
Кінатэатр «Матэрыяльнае» ПЕТЭР
Кінатэатр «Навіны дня»
1) Наступленне на пустыню.
2) Майстры вугалю.
3) Совецкі Данос (кінанарыс).
Кіно «Парыжская Комуна» (Цэнтр. парк культуры і адпачынку) «ДРУЗЬЯ ИЗ ТАБОРА»
Кіно «Спартак» ДУБРОЎСКІ
Дзіцячы кінатэатр «ДРУЗЬЯ ИЗ ТАБОРА»

Патрабуецца ХАТНЯЯ РАБОТНІЦА.
Звяртацца: Кладбішчанская вул., д. № 2, кв. 1. ГАН.

ПАСТАНОВАЙ СНК БССР ад 5 сакавіка 1938 г. № 502
ПРЫ АКАДЭМІІ НАВУК БССР
АРГАНІЗАВАНА
ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ ПА БАРАЦЬБЕ з ДАМАВЫМІ ГРЫБАМІ.
АСНОЎНЫЯ ФУНКЦЫІ ЛАБАРАТОРЫІ:
1 Аператыўнае абслугоўванне будоўляў і будынкаў, якія знаходзяцца ў эксплаатацыі, шляхам дыягностыкі грыбковых пражаванняў, кансультацыі і ўказанняў спосабаў ліквідацыі пражаванняў.
2. Навукова-даследчая работа — па вывучэнню дамавых грыбоў і метадаў барацьбы з імі, па распрацоўцы грыбаўстойлівых канструкцый і іншых праблем, звязаных з гніенем драўніны, і інш.
Адрас лабараторыі: г. Менск, вул. Пушкіна, дом № 58, інстытут біялогіі Акадэміі навук БССР, лабаратарыя па дамавому грыбу, пакой 55-56.

Деликатесные
Соевые соуса
ЛУЧШАЯ ПРИПРАВА К ЛЮБОМУ БЛЮДУ, ЗАКУСКЕ И БУТЕРБРОДУ
СОЯ „КАБУЛЬ" и „ВОСТОК"
ТРЕСТ „СОЮЗПРОМСОЯ" НАРКОМПИЩЕПРОМА СССР
ПРОДАЖА ВО ВСЕХ МАГ. „ГАСТРОНОМ" „БАКАЛЕЯ" и др.
ОПТОВЫЕ ЗАКАЗЫ НАПРАВЛЯТЬ В ТРЕСТ „СОЮЗПРОМСОЯ"
МОСКВА НОВОСЛОБОДСКАЯ 7

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
абвяшчае НАБОР АСПІРАНТАЎ
па 1938-1939 вучэбны год
ПА НАСТУПНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:
а) СТАРАЖЫТНАЯ ГІСТОРЫЯ,
б) ГІСТОРЫЯ СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ,
в) НОВАЯ ГІСТОРЫЯ,
г) МАТЭМАТЫКА,
д) ДЫЯЛЕКТЫЧНЫ І ГІСТАРЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛІЗМ,
е) ПАЛІТЭКАНОМІЯ,
ж) ЛЕНІНІЗМ,
з) ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ.
У аспірантуру прымаюцца асобы не старэй 35 год, маючыя вышэйшую адукацыю.
Усе паступаючыя здаюць кандыдатскі мінімум па дыялектычнаму матэрыялізму, адной з замежных моў і па прадмету выбранай спецыяльнасці.
Залічаныя ў аспірантуру забяспечваюцца стыпендыяй у суме 400 рублёў.
Прыём заяў да 15 верасня.
За даведкамі звяртацца ў вучэбную частку БДУ — гор. Менск, Універсітэцкі гарадок, Прыродазнаўчы корпус. Тэл. 24-206.
ДЫРЭКЦЫЯ.

МЕНСКІ ТРАНСЛЯЦЫЙНЫ РАДЫЕВУЗЕЛ
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА РАДЫЕСЛУХАЧОЎ,
ШТО Ў СУВЯЗІ СА ЗМЕНАЙ ПАРАДКУ ПРАВЯДЗЕННЯ РАЗЛІКАЎ ЗА КАРЫСТАННЕ РАДЫЕКРОПКАМІ з 1 верасня 1938 г.
НЕАБХОДНА ЎСІМ КАРЫСТАЮЧЫМСЯ ТРАНСЛЯЦЫЙНЫМІ РАДЫЕКРОПКАМІ
абмяняць існуючыя абанементныя карткі на абанементныя кніжкі.
АБМЕН І ВЫДАЧА НОВЫХ АБАНЕМЕНТНЫХ КНІЖАК ПРАВОДЗІЦЦА ТОЛЬКІ КАСАЙ МЕНСКАГА ТРАНСЛЯЦЫЙНАГА РАДЫЕВУЗЛА (Совецкая, 33, трэці паверх) з 9 да 16 гадзін штодзённа, апрача агульнавыходных дзён.
ДЫРЭКЦЫЯ РАДЫЕВУЗЛА.

НА ПАДСТАВЕ ПАСТАНОВЫ СНК БССР ад 13 жніўня 1938 г. за № 1764
ПРЫСТУПІЛА ДА РАБОТЫ ЛІКВІДАЦЫЙНАЯ КАМІСІЯ
па ЛІКВІДАЦЫІ
СПРАЎ БЫЛОЙ ГАЛОЎНАЙ РЭДАКЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ СОВЕЦКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ (БелСЭ).
Прапануецца ўсім арганізацыям і асобам, якія маюць прэтэнзіі да БелСЭ, прад'явіць такавыя (падпісчыкі павінны прыкласці квіткі (арыгінал) на атрыманыя ад іх сумы задаткаў) да 5 верасня 1938 г. па адрасу: Менск, Ленінская, 33, Акадэмія навук БССР, ліквідкому БелСЭ.
Пасля ўказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.
ЛІКВІДКОМ БелСЭ.

МЕНСКАЯ КАНТОРА „МЕТАЛЛОМ"
(г. Менск, Совецкая, 50, тэл. № 21-920).
ДА ЎВАГІ арганізацый, устаноў, домаўпраўленняў, каменданцтваў, МТМ, МТС, соўгасаў, калгасаў і домаўладальнікаў!
Здавайце «МЕТАЛЛОМУ» маючыйся ў вас металічны лом.
Заводы чорнай металургіі пераапрацоўваюць лом чорных металаў у сталь.
ЗДАДЗІМ ЗАВОДАМ ЛОМ ЧОРНЫХ МЕТАЛАЎ
У КОЖНЫМ ПРАДПРЫЕМСТВЕ, УСТАНОВЕ, АРГАНІЗАЦЫІ І ДОМАЎПРАЎЛЕННІ ЕСЦЬ ЛОМ ЧОРНЫХ МЕТАЛАЎ, ЯКІ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЗДАН ПРАМЫСЛОВАСЦІ.
НІ АДЗІН КІЛОГРАМ ЛОМУ НЕ ПАВІНЕН АСТАВАЦЦА НЕСКАРЫСТАНЫМ.
Арганізуйце ачыстку сваіх гас падарак, двароў і кладовых ад металічнага лому і здавайце «МЕТАЛЛОМУ».
Здадзены лом аплачваецца па наступных прайскурантных цэнах (зацверджаных па пастанове СТО ад 22 мая 1938 г.) за тону:
жалеза—80 руб.,
чыгун габарыт — 50 руб.,
Чыгун негабарыт—40 руб.,
чыгун гарэлы — 25 руб.,
кровельныя абрэзкі—6 руб.
ЗАГАТОЎКА ЛОМУ ЧОРНЫХ МЕТАЛАЎ ПРАВОДЗІЦЦА ПРАЗ ЗАГАТОЎЧЫЯ ПЛЯЦОЎКІ Ў ГАРАДАХ:
МЕНСК — 2-я Налалачная, тэл. № 20-834.
ГОМЕЛЬ — Гарадзкое балота, тэл. № 13-08.
ВІЦЕБСК — Арлоўская вул., 81-а, тэл № 11-65.
МАГІЛЕЎ — Першамайская (Чыгуначны пераезд), тэл. № 90-63.
БАБРУЙСК — вул. 8 дывізіі.
ОРША — Усходняя вул.
РЭЧЫЦА — Тупік, 12.
Апрача таго прыёмка лому праводзіцца прадстаўнікамі (агентамі) канторы «МЕТАЛЛОМ» ва ўсіх гарадах і раёнах БССР.
ДАСТАЎКА ЛОМУ на загатоўчыя пляцоўкі аплачваецца «Металлому» асобна ад кошту лому па расцэнках Соўнаркома.
ЗДАВАЙЦЕ МЕТАЛІЧНЫ ЛОМ!!!

КАЛУЖСКАМУ ГІДРА-МЕЛІЯРАЦЫЙНАМУ ТЭХНІКУМУ
патрабуецца
ВЫКЛАДЧЫК, ІНЖЫНЕР-МЕЛІЯРАТАР
з прапановамі звяртацца па адрасу: Калуга, Пролетарская, 129.
Калужскому гидро-мелиоративному техникуму

НАРКАМЛЕСУ БССР
патрабуюцца на выезд
ІНЖЫНЕР-БУДАЎНІК,
ІНЖЫНЕРЫ І ТЭХНІКІ МЕХАНІЗАТАРЫ,
НАЧАЛЬНІК ФІНАДДЗЕЛА ТРЭСТА.
Звяртацца ў аддзел кадраў Наркамлеса — Ленінскі вул. Карла Маркса і Комсамольская

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск Совецкая 49 Тэлефоны рэдакцыі рэдактара 21-852; намесніка рэдактара—25-188, сакратарыята 20-830 АДДЗЕЛАЎ: партыйнага—21-853, совецкага будаўніцтва і гандлю—22-412 прамысловага—21-856, сельскагаспадарчага—21-846, літаратуры, мастацтва, навукі і асветы — 23 955, мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-189, аддзела пісем — 20-844 21-898, 21-885, (юс трацыйнага і стыльредактуры — 21-556, аб'яў — 25-384

Уп. Галоўлітбела № Е—5819. Менск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К. М. Б.